ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасьлядоўнаму—у два разы дарожэй. Пры інфарматыўным друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. зьдатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

Усіх краёў злучайцеся! Пралетары

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПАНЯДЗЕЛАК
21 красавіка 1930 г.
№ 93 (3601)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Рэвалюцыйны прыгавар

Працэс над украінскай контр-рэвалюцыйнай скончаны. Рабочыя і сяляне Савецкай Украіны вуснамі пралетарскага суда вынесьлі заслужаны прыгавор «Сьпілцы Вызваленьня Украіны», вызначыўшы контр-рэвалюцыйную сутнасьць гэтай падпольнай арганізацыі.

Увесь ход судовага працэсу над «СВУ», дзень за днём, выкрываў крывавую гісторыю украінскай контр-рэвалюцыі. Старонку за старонкай пералістваў суд,—як гаварыў т. Любчанка,—ня кнігу гэраічнай барацьбы украінскіх працоўных, а кнігу чорнай і здрадніцкай работы украінскай буржуазіі, кулацтва і іх ідэалёгаў—трох партый украінскай контр-рэвалюцыі—кадэтаў, эсэраў і эсдэкаў.

На падставе неабвяргальных дакумантаў, на падставе прызнаньня саміх падсудных прайшоў перад працоўнымі Савецкай Украіны і ўсяго Савецкага Саюзу малюнак доўгай і крывавай барацьбы, якую вяла і вядзе украінская контр-рэвалюцыя супроць незалежнай УССР. Увесь працэс паказаў, што гэтыя партыі толькі прыкрываліся словамі і фразамі аб «самостійности» Украіны. На справе яны былі супроць сапраўднай незалежнай УССР і за ўвесь час свайго існаваньня ня спынялі барацьбы супроць украінскіх працоўных мас. Тав. Любчанка ў сваёй прамове падкрэсьліў вельмі важны палітычны момант, ён гаварыў: «гісторыя расказвае нам, што ад самага пачатку рэвалюцыі і да канца яіколі не абаранялі украінскія дробна-буржуазныя партыі незалежнасьці і самастойнасьці Украіны... Гэтыя партыі гады, калі рускаму капіталізму рабочая кляса над кіраўніцтвам бальшавікоў, занесла рашучы ўдар, гэтыя партыі, як зта ня дзіўна, выступаюць у ролі зьбіральнікаў вялікай сацыяльнай Расіі, у ролі ніцыятараў аднаўленьня капіталістычнага ладу ў межах цэлай Расіі, у ролі астрэльшчыкаў і арганізатараў буржуазнай улады адзінай капіталістычнай Расіі».

Украінскія контр-рэвалюцыянэры акыўна змагаліся за зьвяржэньне на Украіне савецкай улады і ператварэньне Савецкае Украіны ў буржуазна-капіталістычную дзяржаву, якая-б была **калёніяй іжнароднага капіталу.** Яны змагаліся а тое, каб аддаць працоўных Украіны армо нячуванай эксплёатацыі і ўціску сваёй і замежнай буржуазіі. Яны ваходзілі ў простыя і адкрытыя саюзы замежнымі капіталістычнымі дзяржамі.

Гэтыя партыі украінскай контр-рэвалюцыі актыўна служылі польскаму генэральнаму штабу. Яны заключалі давары з Пілсудзкім і Юзэфскім. Яны алі актыўную контр-разьведачную працу па заданьнях польскай дэфэнзывы. Праграмай «СВУ» была «адкрытая праграма рэстаўрацыі капіталістычнага ладу на Украіне», падпарадкаваньне яе арыска-варшаўскай біржы». «СВУ», у ешным саюзе і пад кіраўніцтвам польскага фашызму і ўсяго сусьветнага імэрыялізму, рыхтаваў узброены паход Савецкую Украіну. Украінская контрэвалюцыя,—гэта з усёй яскравасьцю шэ раз паказаў працэс,—актыўна дрыхтоўвала ваенную інтэрвэнцыю, ая навінна была ў крыві мільёнаў рацоўных Савецкай Украіны паталіць абоча-сялянскую ўладу і ўстанавіць анысцкую дыктатуру.

На працягу ўсёй сваёй гісторыі і дзейсьці, украінская контр-рэвалюцыя і палітычныя партыі актыўна змагаліся супроць сацыялістычнага будаўцтва Савецкай Украіны, за зрыў вялікай творчай працы, якую вядуць украінскія працоўныя масы. Выкарыстоўваючы Акадэмію навук і давер'е савецкай улады да паасобных навуковых дзеяў—усе гэтыя Яфрэмавы, Чахоўскія, Ніўскія і К-о, шляхам шкодніцтва, сатажу, індывідуальнага тэрору, арганізацыяй банд вялі барацьбу супроць пратарскай дыктатуры, рыхтуючы ўзброае зьвяржэньне рабоча-сялянскай улады. Тав. Любчанка, у сваёй прамове, прывёў цікавую «папраўку», якую эрабіў падсудны Яфрэмаў, у акт абвінавачаньня: «Там напісана, што я сказаў зьнішчыць мільёны камуністых, а трэба—мільён камуністых». У гэтай характэрнай «папраўцы»—заключаны сэнс тых шляхоў, па якіх ішла і ідзе украінская контр-рэвалюцыя. Гэта шляхі крывавай разьні працоўных, гэта шляхі масавых расстрэлаў, шыбеніц і пагромаў, як спосаб зьнішчэньня ненавіснай ім Савецкай Украіны.

Словамі саміх-жа падсудных пацьвердзілася ўсё іх крываваe аблічча—аблічча агалцелых бандытаў і наймітаў замежнага капіталу. Падсудны Падгаецкі проста заяўляе: «Я фактычна прадаваў Украіну і Савецкі Саюз капіталістычнаму сьвету».

Суровая рука пралетарскага суда апусьцілася на галаву гэтай контр-рэвалюцыйнай шайкі. Працоўныя масы Савецкай Украіны, працоўныя ўсяго Савецкага Саюзу, у тым ліку і БССР, працоўныя Заходняй Украіны і Беларусі сустрэнуць з вялізарным задавальненьнем прыгавар рэвалюцыйнага суда.

Узрастаючая Савецкая Украіна—рэспубліка буйной сацыялістычнай прамысловасьці, Днепрабуду, рэспубліка калектывізацыі сельскае гаспадаркі, краіна ўзрастаючай пралетарскай украінскай культуры— раздушыла контр-рэвалюцыйную змову. Выразна і ясна выступае тут наяўнасьць толькі двух лягераў барацьбы, двух франтоў. З аднаго боку—фронт міжнароднага капіталу, разам з ім—украінскай контр-рэвалюцыі, украінскага буржуа, кулака, украінскіх дробна-буржуазных партый, з другога боку—лягер рэвалюцыі, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, лягер будуючагася сацыялізму, лягер шырокіх працоўных мас Савецкай і Заходняй Украіны, разам з шырокімі працоўнымі масамі ўсяго Савецкага Саюзу, усяго сьвету. Ніякай сярэдзіны паміж гэтымі двума франтамі няма і быць ня можа. Хто не ў радох рэвалюцыйнага фронту, той разам з Чахоўскім і Яфрэмавым.

Працоўныя Савецкай Беларусі вітаюць прыгавар Вярхоўнага суда УССР. Рабочыя і працоўныя сяляне Савецкай Беларусі разам з гэтым улічаць усе палітычныя урокі гэтага працэсу над украінскай контр-рэвалюцыяй.

На Беларусі, як і на Украіне, лягер беларускай контр-рэвалюцыі, лягер усіх буржуазных і дробна-буржуазных партый быў і ёсьць лягерам нясупыннай барацьбы супроць Савецкай Беларусі, супроць яе незалежнасьці і вольнага сацыялістычнага разьвіцьця ў сям'і вызваленых народаў Савецкага Саюзу.

Беларускі нацыянал-дэмакратызм, беларуская контр-рэвалюцыя прадавала сябе і Беларусь «гуртам і ўраздроб» то нямецкім імпэрыялістым, то Пілсудзкаму, то рускім генэралам. Уся тая гэраічная рэвалюцыйная барацьба, якую вялі беларускія працоўныя масы за Савецкую Беларусь, у саюзе з працоўнымі былой царскай Расіі пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў, была барацьбой супроць аб'яднаных сіл рускай, нямецкай, польскай і беларускай контр-рэвалюцыі. Гэта была барацьба ня толькі супроць рускіх генэралаў, супроць нямецкіх і польскіх акупантаў, гэта была барацьба і супроць Луцкевічаў і усіх іншых гэрояў беларускага буржуазнага нацыяналізму. Толькі ў рашучай і няпрымірымай барацьбе супроць беларускага нацыяналізму, супроць беларускай буржуазіі, супроць дробна-буржуазных служкаў замежнага капіталу магла паўстаць незалежная Савецкая Сацыялістычная Беларусь.

Беларускія нацыянал-дэмакраты, як і іх браты украінскія контр-рэвалюцыянэры, выкарыстоўвалі лёзунг «незалежнасьці» для рашучай і непарыўнай барацьбы супроць беларускіх працоўных мас, супроць сапраўднай незалежнай Савецкай Беларусі. Цікава, што беларускія нацыянал-дэмакраты, так як і іх украінскія браты, сам лёзунг «незалежнасьці» высунулі толькі пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пад сьцягам аблудных фраз аб «незалежнасьці» Луцкевіцкія «дзеячы» ўваходзілі ў саюз з Вільгэльмам і Пілсудзкім, актыўна змагаліся ў радох бела-польскіх банд супроць савецкай улады на Беларусі.

Яны ішлі на ўсё для таго, каб задушыць рэвалюцыйны рух на Беларусі, каб зваліць пралетарскую дыктатуру і зьнішчыць Савецкую Беларусь.

Абвостраная клясавая барацьба ў нашай краіне, якая выклікаецца разгорнутым і непераможным сацыялістычным наступленьнем працоўных пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, знаходзіць сваё адлюстраваньне і ў значнай актывізацыі беларускага нацыянал-дэмакратызму, як ідэалёгіі і палітычнай зброі беларускай буржуазіі і кулацтва, у актывізацыі іншых шавінізмаў. Дружны саюз беларускага нацыянал-дэмакратызму—тут з беларускім нацыянал-фашызмам—там, за межамі,—гэта тыя сілы, якія і сёньня вядуць барацьбу супроць Савецкай Беларусі. Яны імкнуцца ў саюзе з польскім фашызмам і пад яго непасрэдным кіраўніцтвам, ператварыць БССР, накшталт Заходняй Беларусі—у калёнію польскага імэрыялізму. Яны, як і украінская контр-рэвалюцыя, сваім ідэалам лічаць стварэньне фашыскай дыктатуры, якая-б на трупах беларускіх працоўных адновіла ўладу абшарніка і капіталістага.

Луцкевіцкая банда там, у Заходняй Беларусі, актыўна працуючы ў польскай дэфэнзыве, на грошы акупантаў, вядзе шалёную барацьбу з заходня-беларускімі рабочымі і працоўнымі сялянамі, з нацыянальна-вызваленчым рухам. Луцкевіцкія нацыянал-фашыстыя ідуць у першых радох анты-савецкай хлусьні. Яны зьяўляюцца натхніцелямі самай брудной кампаніі супроць Савецкай Беларусі, яны адкрыта прапаведуюць «крыжовы паход» супроць чырвонага Менску, яны адкрыта бяруць пад сваю абарону ліквідуемае намі ў БССР кулацтва. Луцкевіцкія нацыянал-фашыстыя прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і арганізацыі вайны супроць Савецкай Беларусі. Луцкевічы і іх малайцы разам з украінскімі нацыянал-фашыстымі далкам салідарызаваліся з Яфрэмавымі і Чахоўскімі. Маладыя бандыты Луцкевіча нават рабілі няўдалыя спробы хуліганскіх нападаў на рабоча-сялянскія арганізацыі, на прадстаўнікоў рэвалюцыйнага руху ў знак салідарнасьці з украінскай контр-рэвалюцыяй і беларускімі нацыянал-дэмакратамі. Луцкевіцкая газэта «Наперад» можа ўзяць пальму першынства ў тэй агідной кампаніі бруду, які яна вылівае на БССР—вольную і сапраўды незалежную рэспубліку рабочых і сялян.

А нацыянал-дэмакратычная контр-рэвалюцыя тут, у БССР, працягвае руку брацкага саюзу луцкевіцкім нацыянал-фашыстым. Яна вядзе барацьбу супроць савецкай улады. Яе асноўная сацыяльная апора—кулак—аказвае шалёнае супраціўленьне наступаючай пралетарскай дыктатуры. Беларускае кулацтва ня хоча добраахвотна выходзіць з арэны гісторыі і пушчае ў ход усякую зброю, каб сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва, каб сарваць будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры. Нашы перамогі ў будаўніцтве індустрыяльна-калгаснай Савецкай Беларусі і беларускай пралетарскай культуры, якія мы дасягаем пры дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу—гэта магутныя ўдары па контр-рэвалюцыі.

Наша партыя рашуча змагаецца з праяўленьнямі вялікадзяржаўнага расійскага, беларускага, яўрэйскага, польскага і інш. шавінізмаў, якія аб'яднаюцца ў сваёй барацьбе супроць савецкай улады. Партыя асабліва завастрыла барацьбу супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, як галоўнай небясьпекі ў сучасны пэрыяд. Гэта барацьба партыі зьяўляецца складанай часткай нашай агульнай барацьбы за ўзмацненьне пралетарскай дыктатуры, за пасьпяховае будаўніцтва сацыялістычнай Беларусі.

«Члены «СВУ»,—гаварыў у сваёй прамове т. Любчанка,—думалі, што кусаць ім прыдзецца вала, аб якім гаварыў падсудны Дурдукоўскі, але, кусаючы, яны напароліся на жалеза і бэтон, з якіх зроблена украінская Савецкая Рэспубліка».

Працоўныя масы Савецкай Беларусі, пад кіраўніцтвам кампартыі, разам з працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу, вядуць і будуць весьці ўпартую барацьбу за пабудову сацыялізму, робяць і зробяць усё, каб спробы ўкусаў з боку ўсякай контр-рэвалюцыі і надалей натыкаліся-б на жалеза і бэтон пралетарскай дыктатуры.

Напярэдадні баявога мая

Набліжаецца дзень 1-га мая, дзень аўнічага пралетарскага інтэрнацыяналізму, дзень, абвеяны шматгадовымі адыцыямі рэвалюцыйнае барацьбы бочае клясы.

1-га мая пралетарыят усяго сьвету адэманструе сваю баявую магутсьць, сваю гатоўнасьць да барацьбы дыктатуру пралетарыяту, за зьнішньне капіталістычнага ладу. Пралетарыят капіталістычных краёў выйдзе на ліцу са сваімі камуністычнымі лёзунгамі, выйдзе са сваімі пралетарскімі ясавымі жаданьнямі на арэну адкрыае барацьбы за сваё эканамічнае і палітычнае вызваленьне.

У гэтым годзе сьвяткаваньне 1-га мая капіталістычных краёў адбываецца ва ювах абвостранага крызісу, масавага спрацоўя. Першамайскае сьвяткаваньадбываецца ва ўмовах відавочнага звалу капіталістычнае «стабілізацыі» нарастаючага рэвалюцыйнага ўздыму.

За апошні час мы мелі цэлы рад міжродных, баявых пралетарскіх рэвацыйных выступленьняў. Мы мелі ралетарскія выступленьні ва ўсіх каталістычных краёў у дзень 1-га жніўа, 6-га сакавіка і інш. Гэтыя выступньні паказалі, што рабочая кляса оцістаўляе наступленьню буржуазіі аё пралетарскае контр - наступленьне, ў некаторых мясцох нават наступньне. Яны сьведчаць аб уздыме пратарскага руху на больш высокую ступень масавай палітычнай барацьбы супроць буржуазнай дыктатуры.

Перарастаньне эканамічных сутычак шырокую палітычную барацьбу ўзрае рамкі буржуазнай легальнасьці і ракульвае картачныя домікі буржунае «дэмакраты». Хлусьлівасьць яе ановіцца відавочнай самым шырокім асам па меры разьвіцьця фашызацыі ржуазнай дзяржаўнасьці і выкрыцьця радніцкай ролі сацыял-фашыстых.

У гэтых умовах у радзе цэнтраў ўстае пытаньне ўжо не аб дэманстрах, а аб масавай палітычнай забаоўцы, накіраванай супроць дыктатуры капіталу.

Ужо цяпер у радзе капіталістычных аёў (Нямеччына, Францыя, Польшча інш.) камуністычныя партыі разгортуць вялізарную работу навакол падхтоўкі да 1-га мая. У Бэрліне, наыклад, адбылася нарада, якая абгавала пытаньне «арганізацыі адзінага ралетарскага фронту масавых забастовак і масавых дэманстрацый у дзень га мая». Нарада выпусьціла адозву да іх рабочых, у якой зазначаецца: «У тым годзе 1-ае мая павінна прайсьці д знакам арганізацыі пралетарскага ступленьня супроць дыктатуры фінсавага капіталу і антысавецкай ванай падрыхтоўкі імпэрыялістых. Рачныя павінны дабівацца, каб на кожным прадпрыемстве адбылася масавая палітычная забастоўка ў дзень 1-га мая. Рабочыя павінны памятаць урокі 1-га мая 1929 году і пратэставаць супроць тэрору сацыял-фашызму. Ні адзін рабочы не павінен браць удзелу ў сьвяткаваньнях, якія арганізуюцца сацыял-дэмакратыяй і прафбюракратыяй».

Барацьба з беспрацоўем, барацьба за павышэньне жыцьцёвага ўзроўню галадаючых рабочых цесна ўвязваецца з барацьбой супроць небясьпекі вайны супроць Савецкага Саюзу.

Пры актыўным падтрыманьні сацыял-фашысцкага II-га Інтэрнацыяналу, імпэрыялістыя рыхтуюць новую вайну супроць Савецкага Саюзу. Пагроза вайны непасрэдна навісла над Савецкім Саюзам. Яшчэ ніколі гэта небясьпека ня была такой актуальнай, такой пагражаючай, як цяпер. Аб гэтым гаворыць цэлы рад фактаў, як напрыклад, стварэньне палкоўніцкага ўраду ў Польшчы, антысавецкая кампанія царкоўнікаў, антысавецкія прыгавары парыскага і бэрлінскага судоў, антысавецкія вылазкі супроць нашых гандлёвых прадстаўніцтваў заграніцай і г. д.

У дзень 1-га мая працоўныя ўсяго сьвету выступяць у абарону СССР. У адказ на антысавецкія козьні імпэрыялістых працоўныя абернуць дзень 1-га мая ў дзень абароны Савецкага Саюзу, накшталт таго, як гэта было ў дні мінулых пралетарскіх выступленьняў.

Першамайскія сьвяты ў Савецкім Саюзе павінны ператварыцца ў масавы агляд нашых дасягненьняў на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба выразна, пераконваюча паказаць кожнаму працоўнаму нашага краю нашы дасягненьні апошняга году ў індустрыялізацыі краіны, у барацьбе за выкананьне прамфінпляну, у пабудове новых заводаў - гігантаў і г. д. Трэба самым шырокім чынам папулярызаваць палітыку партыі ў вёсцы ў галіне калектывізацыі, паказаць вялізарныя дасягненьні, усебакова азнаямляць масы з артыкуламі тав. Сталіна і пастановамі партыі і ўраду аб дапамозе калгаснаму сэктару вёскі і аб барацьбе з скрыўленьнямі партыйнай лініі.

У нас, у БССР, трэба акрамя таго папулярызаваць дасягненьні партыі і савецкай улады ў галіне правядзеньня палітыкі, у барацьбе з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмам усіх колераў.

Трэба старанна падрыхтаваць першамайскія сьвяткаваньні. Трэба мабілізаваць усе сілы для належнай падрыхтоўкі і правядзеньня гэтага сьвята.

Трэба сачыць за тым, каб гэтае сьвята мела выразна палітычны характар.

Мы павінны змагацца са спробамі спустошыць баявы, палітычны, рэвалюцыйны зьмест гэтага сьвята.

Добра праведзенае ворыва ў калгасах

узмацняе тэмп палявых работ у індывідуальным сэктары

Шырэй азнаёміць беднякоў і сераднякоў з ільготамі па сельгаспадатку

Прырост засеўных плошчаў вызваляецца ад падатку. За незасеяныя плошчы падатак спаганяецца па леташніх нормах.

Калгасьнікі ўцягваюць індывідуальнікаў у арганізаваную сяўбу

Добра наладжанай работай калгасы значна узьнялі свой аўтарытэт сярод сялянства

У Лельчыцкім раёне (Мазыршчына) ужо шырока разгарнуліся палявыя работы. Як калгасьнікі, так і індывідуальныя гаспадаркі возяць гной, аруць і сеюць.

Аднак, у часе правядзеньня засеўнай кампаніі было зроблена шмат памылак, прайсьці міма якіх ні ў якім разе нельга.

У самы разгар кампаніі было зьнята лельчыцкае кіраўніцтва як партыйнае, так і савецкае, якое зрабіла шмат грубых палітычных памылак пры арганізацыі калгасаў. Зразумела, былое кіраўніцтва, якое канчаткова збанкрутавала, не магло далей з посьпехам весьці работу. Але замест зьнятых работнікаў на замену ня былі вылучаны другія. У выніку раён часова застаўся без кіраўніцтва. Гэта дрэнна адбілася на правядзеньні засеўнай кампаніі. Мясцовыя работнікі вельмі марудзілі з адводам зямлі для індывідуальных бяднацка-сераднацкіх гаспадарак. Гэта выкарысталі кулакі для сваёй контр-рэвалюцыйнай агітацыі за зрыў засеўнай кампаніі, за нявыхад у поле.

Артыкул тав. Сталіна «Адказы таварышом калгасьнікам» і новыя ільготы калгасам ня былі папулярызаваны сярод шырокіх мас сялянства і абмяркоўваліся толькі на сходах калгасьнікаў.

Калгасы не атрымалі своечасовай і выстарчальнай дапамогі з боку раённага цэнтру, у прыватнасьці, з боку Паляводсаюзу.

Наогул Паляводсаюз пічога не зрабіў, каб дапамагчы калгасам выйсьці ў поле. Кулакі-ж у гэты час разьвівалі шалёную агітацыю сярод індывідуальных бяднацка-сераднацкіх гаспадарак за тое, каб не пачынаць палявых работ.

З цяжкага становішча вывела раён актыўнасьць мас калгасьнікаў. Калгасьнікі арганізаваным чынам выйшлі ў поле і пачалі араць.

У вёсцы Сімаановічы кулакі вялі агітацыю за нявыхад у поле, даводзячы, што сяляне абыйдуцца і без сяўбы, што яны пражывуць заработкамі ад сплаву. Некаторыя спачатку падпалі было над уплыў кулакоў.

Калі-ж сяляне ўбачылі, што калгас ужо засеяў 10 дзесяцін, настрой іх адразу зьмяніўся і яны таксама пачалі сяўбу.

У вёсцы Баравічы сяляне чакалі і не прыступалі да палявых работ, пакуль калгаснае ворыва не падыйшло шчыльна да іх палосак. **Толькі пасьля гэтага яны актыўна ўзяліся за палявыя работы і ўзаралі ня толькі свае палоскі, але і зямлю з дзяржаўнага фонду, якая была ім адведзена лясьніцтвам. Так, калгасы сваёй арганізаванасьцю далі наглядны ўрок кулацтву.**

У Лельчыцкім раёне, які знаходзіцца па вялікай адлегласьці ад акружнога цэнтру, дзе пры арганізацыі калгасаў быў дапушчан рад грубейшых палітычных памылак, адліў з калгасаў быў даволі значны. Зараз процант калектывізацыі па раёне дасягае 9-10. **Але затое большасьць калгасаў, якія засталіся, зьяўляюцца сапраўднымі фарпостамі калектыўнага руху.** Калгасьнікі вытрымалі шалёны націск кулацкай агітацыі і зараз з посьпехам вядуць барацьбу за далейшае замацаваньне калгасаў. Гэта, зразумела, ня можа не аказаць свайго ўплыву па навкольнае насельніцтва, асабліва на беднату. **Аўтарытэт большасьці калгасаў сярод сялянства значна ўзрос.** Многія беднякі, якія выйшлі раней з калгасаў, **зараз ужо зразумелі, што зрабілі памылку. Частка з іх ужо падае заявы аб прыёме іх зноў у калгасы.**

Ці ёсьць пэрспэктывы для далейшага росту калгасаў у раёне? На гэтае запытаньне можна адказаць з поўнай упэўненасьцю, што пэрспэктывы гэтыя вельмі значныя. Ва ўсіх сельсаветах створаны ачагі калгаснага руху. Зараз усё будзе залежаць ад пастаноўкі работы ўнутры саміх калгасаў. Добра наладжаная работа калгасаў стане лепшым агітатарам і прапагандыстым за далейшае пашырэньне і замацаваньне калгаснага руху. У калгасьнікаў ёсьць вялікае жаданьне і воля. **Калі ім своечасова будзе аказана дапамога і падтрыманьне, мы ўжо увосень можам стаць сьведкамі значнага прыліву ў калгасы.**

Гэта вымагае **ад раённых арганізацый,** асабліва ад райпаляводсаюзу, большай увагі да калгаснага руху, практычнай яму дапамогі.

А. ВАЙЦОК.

Лельчыцы.

«Пояць стальнога каня» (ахаладжваюць радыятар) перад выхадам на работу

Трактарная калёна ---у калгасах Мазыршчыны

МАЗЫР. ГЭТЫМІ ДНЯМІ Ў КАЛГАСЫ МАЗЫРШЧЫНЫ ПРЫБЫЛО 7 ТРАКТАРАЎ. 5 ТРАКТАРАЎ ПЕРАДАНЫ Ў ДАМАНАВІЦКАЕ КУСТАВОЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ, ДВА ТРАКТАРЫ — У ЮРАВІЦКІ РАЁН, У КАЛГАС ІМЯ ЧАРВЯКОВА.

КАЛГАСЬНІКІ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА ВАКОЛІЧНЫХ ВЁСАК СУСТРЭЛІ ТРАКТАРЫ З ВЯЛІКІМ ЭНТУЗІЯЗМАМ. ТРАКТАРЫ ЎЖО ПАЧАЛІ ВОРЫВА.

У СУВЯЗІ З ПРЫБЫЦЬЦЕМ ТРАКТАРАЎ АДЗНАЧАЕЦЦА ПРЫЛІЎ У КАЛГАСЫ ГЭТЫХ РАЁНАЎ.

ФРАЙМАН.

Тэлеграма наркамфіна СССР тав. Бруханава

ТАВ. БРУХАНАВЫМ РАЗАСЛАНА НА МЕСЦЫ НАСТУПНАЯ ТЭЛЕГРАМА:

— «У МЭТАХ ПАШЫРЭНЬНЯ ЗАСЕЎНАЕ ПЛОШЧЫ, ШЫРОКА ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА, ШТО Ў ВЫПАДКАХ, КАЛІ АСОБНЫЯ ЧЛЕНЫ СЯЛЯНСКІХ ГАСПАДАРАК АДМАЎЛЯЮЦЦА АД СВАІХ ЗЯМЕЛЬНЫХ НАДЗЕЛАЎ, СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫ ПАДАТАК З ГЭТЫХ ГАСПАДАРАК БУДЗЕ СПАГАНЯЦЦА ПАВОДЛЕ ПЛОШЧЫ ЗАСЕВУ, АБО ВОРЫВА МІНУЛАГА ГОДУ.

У ТОЙ-ЖА ЧАС КАЛГАСЫ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ГАСПАДАРКІ, ЯКІЯ АТРЫМАЛІ ГЭТЫЯ ПАКІНУТЫЯ НАДЗЕЛЫ ДЛЯ СКАРЫСТАНЬНЯ ПАД ЗАСЕЎ, ВЫЗВАЛЯЮЦЦА Ў 1930-31 г. АД ВЫПЛАТЫ С.-Г. ПАДАТКУ ЗА ГЭТЫЯ НАДЗЕЛЫ.

Прадукцыйнасьць працы ў калгасах вышэй, чым у індывідуальнікаў

Папулярызацыя артыкулаў тав. Сталіна і апошніх пастаноў партыі і ўраду аб ільготах калгасьнікам ужо дала пэўныя вынікі ў Чашніцкім раёне, Віцебскай акругі. Зараз ня толькі спыніўся адсеў, але адзначаецца і сталы прыліў, у выніку якога ў калгасах на сёнешні дзень НАЛІЧВАЕЦЦА КАЛЯ 28% БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК РАЁНУ. Некалькі-ж дзён таму назад было 24%. Прыліў з кожным днём расьце. Гэтаму спрыяе падрыхтаваны выхад калгасаў у поле, энтузіязм, з якім працуюць калгасьнікі.

НЕАБХОДНА АДЗНАЧЫЦЬ, ШТО КАЛГАСЬНІКІ ПАКАЗАЛІ ВЫСОКУЮ СТУПЕНЬ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦІ ПРАЦЫ. У РАДЗЕ КАЛГАСАЎ ЯНА СКЛАДАЕ 120-130% Ў ПАРАЎНАНЬНІ З СЯРЭДНЯЙ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЮ ІНДЫВІДУАЛЬНАЙ СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРКІ. НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА НЕДАХВАТ РАБОЧАЙ СІЛЫ Ў НЕКАТОРЫХ КАЛГАСАХ, ЯРАВЫ КЛІН БЯЗУМОЎНА БУДЗЕ ПАШЫРАНЫ Ў ПАРАЎНАНЬНІ З ПЛЯНАМ.

Камуна «Чырвоны Барацьбіт» ужо скончыла араць як свой яравы клін, так і зямлю тых гаспадарак, якія ўвесну ўліліся ў камуну. Зараз яна прыступіла ДА ВОРЫВА ЗВЫШ ПЛЯНУ. Камуна намеціла пашырыць плян на 45% за лік папару і на 6% за лік залежаў.

Канюшына па жыце пасеяна ўжо ўсімі калгасамі раёну. Пачалася сяўба аўсу і ячменю.

ПАСЬПЯХОВЫ ХОД СЯЎБЫ Ў КАЛГАСАХ, ВЫСОКАЯ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ КАЛГАСЬНІКАЎ І ІХ ДЫСЦЫПЛІНАВАНАСЬЦЬ ЗЬЯВІЛАСЯ НАЙЛЕПШЫМ СРОДКАМ БАРАЦЬБЫ З КУЛАЦКАЙ АНТЫКАЛГАСНАЙ АГІТАЦЫЯЙ, ЯКОЮ ЯНЫ ХАЦЕЛІ ДАВЕСЬЦІ, ШТО Ў КАЛГАСАХ НІБЫ ПРАЦУЮЦЬ ТОЛЬКІ АДНЫ ЛОДЫРЫ, ШТО КАЛГАСЫ НЯ СПРАВЯЦЦА З СЯЎБОЙ і г. д.

Брыгадзір «Зьвязды» ТАМІЛІН.

УВЕСЬ ПОПЕЛ---НА МАР'ІНА!

МЕНСК УЖО АДГУКНУЎСЯ НА ПРАПАНОВУ „ЗЬВЯЗДЫ"

Што робяць Бабруйск і Барысаў?

Учора «Зьвязда» паведамляла, што ў сувязі з невыкананьнем пляну завозу попелу зрываецца пасеўная кампанія ў саўгасе імя «Дзесяцігодзьдзя БССР» і ў камуне імя «БВА», якія знаходзяцца на мэліяраваных балотах Мар'інскага масыву. «Зьвязда» зьясьняла пытаньне аб арганізацыі тэрміновай адгрузкі ў Менску, Бабруйску і Барысаве ўсёй наяўнай колькасьці попелу ў саўгас імя «Дзесяцігодзьдзя БССР» і ў камуну імя «БВА». Гэта работа павінна быць выканана ў бліжэйшыя-ж 2-3 дні.

Менскія цэнтральныя і акруговыя арганізацыі адгукнуліся на гэтую прапанову, прызналі яе вельмі мэтазгоднай і яшчэ ўчора прынялі некторыя меры да арганізацыі збору і адгрузкі попелу на Мар'іна.

Белсельтрэст заявіў, што ён камандыраваў у Барысў інспэктара т. Калініна для арганізацыі адгрузкі попелу, які ёсьць там на прадпрыемствах, у саўгас і камуну па Мар'іне. Упоўнаважанаму Белсельтрэсту па Менскай акрузе т. Казырэўскаму даручана тэрмінова зьвязацца з Менскім акрпаляводсаюзам і акругкомам ЛКСМБ і арганізаваць збор і адгрузку попелу з Менску.

Менскі акрпаляводсаюз паведаміў, што ён вылучыў камісію з трох чалавек—т. т. Карнейчыка, Грынкевіча і Сарокі—для арганізацыі праверкі наяўнай колькасьці попелу ў Менску і тэрміновай адпраўкі яго на Мар'іна.

Белпаляводсаюз паслаў у Белжылсаюз наступную тэлефонаграму: «Нам вядома, што ў скрынях жактаў і на прадпрыемствах Менску, Бабруйску і Барысава ляжыць вялікая колькасьць незабранага да гэтага часу калгасамі попелу. Увесь гэты попел трэба зараз-жа адгрузіць на Мар'іна.

Белпаляводсаюз просіць сёньня-ж дагаварыцца з акрпаляводсаюзам, Белсельтрэстам і акрза аб неадкладнай арганізацыі гэтае справы».

Менскі акругком ЛКСМБ сёньня на сакратарыяце распрацуе падрабязныя мерапрыемствы па арганізацыі збору попелу. Заўтра менскі камсамол прыступіць да выяўленьня наяўнасьці попелу, да збору і адгрузкі яго па Мар'іна. Барысаўскаму райкому ЛКСМБ паслана тэлеграма аб неадкладнай арганізацыі гэтай справы.

Барысаўскі райком камсамолу ўжо рэагаваў на наш артыкул. Справа арганізацыі збору і адгрузкі попелу даручана «Лёгкай кавалерыі». Да збору попелу прыцягваецца Барысаўская піянэр-арганізацыя.

Трэба, між іншым, адзначыць, што Менскі акругком камсамолу гэтымі днямі арганізаваў збор попелу камсамольскай арганізацыяй і піянэрамі і школьнікамі. Мен. АК дагаварыўся з Менакрэзам, каб апошні прыслаў а 10 гадзіне раніцы 150 вазоў для адгрузкі попелу. Аднак, Менакрэз гэтага ў тэрмін не зрабіў — фурманкі зьявіліся толькі а 12 гадзіне, прычым прыехала толькі частка. З прычыны гэтага, збор попелу быў сарваны.

КІРАЎНІК БАРЫСАЎСКАЙ ФЭРМЫ ЗРЫВАЕ СЯЎБУ Ў СУСЕДНІМ КАЛГАСЕ

Зараз-жа перакінуць трактар у калгас „Усход"

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону ад нашага кар.). У калгасе «Усход», Барысаўскага раёну, ёсьць недахват у пятавай сіле. Засеўная кампанія ў калгасе пад пагрозай зрыву. 365 гэкт. могуць застацца незасеянымі.

Барысаўскі райкалгасаюз і райком КП(б)Б прапанавалі Ст.-Барысаўскай фэрмс, якая належыць Барысаўскаму ЦРК, тэрмінова перакінуць у калгас 1 трактар для правядзеньня засеўнай кампаніі. Кіраўнік фэрмы Пукшанскі адмовіўся перакінуць трактар у той час, калі фэрма мае 39 коняй, 2 трактары, а зямлі — 280 гэкт.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці такіх кіраўнікоў, якія зрываюць засеўную кампанію ў калгасах.

Увазе Аршанскай АКК

24-га лютага г.г. грамадзянін вёскі Васькоўшчыны, Веравайнанскага сельсавету,

Зьлёт рэвалюцыйнай моладзі ў Лейпцыгу

БЭРЛІН, 20. З Лейпцыгу паведамляюць, што з усіх раёнаў Нямеччыны ўсё яшчэ прыбываюць калёны ўдзельнікаў «Дня моладзі». У Лейпцыгу ўжо сабралася 15.000 маладых рабочых. Разам з сілезкай дэлегацыяй прыехала дэлегацыя польскай рэвалюцыйнай моладзі. Рэвалюцыйныя рабочыя Лейпцыгу арганізавалі ўрачыстае спатканьне ўдзельнікам зьезду. Паліцыя і ўлады сыстэматычна перашкаджаюць працы зьезду. Паліцыя робіць вобыскі сярод прыяжджаючых, шукаючы ня́існуючай зброі, пераглядае і канфіскуе лёзунгі і часта разганяе прыбываючыя атрады.

Зьезд атрымаў прывітальныя тэлеграмы ад Ленінскага камсамолу СССР, ад нямецкага камсамолу і анты-фашысцкай маладой гвардыі, а таксама прывітаньні ад камсамольскіх арганізацый іншых краёў.

Для ўдзелу ў «дні моладзі» ў Лейпцыг, між іншым, прыехалі таксама групы апазыцыйных членаў сацыял-дэмакратычнага саюзу моладзі з **Бэрліна, Хэмніца, Касэля і Баварыі** і дэлегацыя ад апазыцыйнай каталіцкай моладзі. Бэрлінскія дэлегацыі, якія прыехалі ўчора на 51 грузавіку, сустракаліся працоўнымі ў гарадох і вёсках з вялікім уздымам. Учора ўвечары ў Лейпцыгу адбылося 9 вялізарных мітынгаў. На працягу ўсяго дню паліцыя прабавала зрываць праведзеньне «дню моладзі». Былі забаронены паходы з музыкай. У некаторых мясцох адбыліся сутычкі паміж удзельнікамі «дню моладзі» і паліцыяй. Учынены шматлікія арышты.

Да поўдня лік удзельнікаў «дню моладзі» дасягнуў **28.000**. Новыя групы рабочай моладзі прыяжджаюць у Лейпцыг. Сёньня раніцою адбылася дэманстрацыя «антыфашысцкай маладой гвардыі», у якой брала ўдзел больш тысячы чалавек. Дэманстранты прайшлі па многіх вуліцах Лейпцыгу, у прыватнасьці міма будынку дзяржаўнага суду. Лейпцыгскія рабочыя, якія сабраліся на вуліцы, шчыра віталі дэманстрантаў. Сёньня адбыўся мітынг саюзу юных спартакаўцаў, у якім прыняло ўдзел больш за 2.000 дзяцей.

У Лейпцыг прыехаў сёньня тав. **Тэльман. Вялізарны натоўп** удзельнікаў «дню моладзі», які сустракаў яго, **на руках вынес Тэльмана з вакзалу.**

Адозва Усеэўрапэйскага сялянскага камітэту

БЭРЛІН, 20. Усеэўрапэйскі сялянскі камітэт зьвярнуўся да працоўнага сялянства Эўропы з адозвай, у якой падагульвае вынікі Усеэўрапэйскага кангрэсу працоўнага сялянства ў Бэрліне. Адозва канстатуе, што работа кангрэсу выкрыла жахлівае становішча працоўнага сялянства, нагалоўную галеву ў выніку нячуванай экспляатацыі з боку абшарнікаў, капіталістых і апарату буржуазнай даяржаўнай улады. **Многія тавы званыя сялянскія партыі і арганізацыі знаходзяцца фактычна пад кіраўніцтвам абшарнікаў і кулакоў,** і не ведуць актыўнай барацьбы супроць прыгнечаньня і экспляатацыі.

Адозва заклікае працоўнага сялянства Эўропы, абапіраючыся на баявую пляцформу, выпрацаваную бэрлінскім кангрэсам, змагацца ў саюзе з пралетарыятам супроць падатковага цяжару і ліхварства, супроць фашызму і ваеннай небясьпекі, за зямлю і ў абарону Савецкага Саюзу, які паказаў адзіны правільны шлях да вызваленьня сялянства.

Растлумачэньне Наркамфіну СССР

МАСКВА. На мясцох часта ня ведаюць, якія сельска-гаспадарчыя аб'яднаньні ня ападаткаваньні лічыць таварыствамі па грамадзкай апрацоўцы зямлі, а якія — прасьцейшымі таварыствамі.

У сувязі з гэтым Наркамфін СССР растлумачвае:

Таварыствамі па супольнай апрацоўцы зямлі трэба лічыць аб'яднаньні, у якіх абагулены зямельныя надзелы і ў якіх зямля апрацоўваецца калектыўна членамі аб'яднаньня. Аграмаданая апрацоўка зямлі можа адбывацца пры гэтым або абагуленым с.-г. інвэнтаром (сельска-гаспадарчыя машыны і прылады, рабочая жывёла), або інвэнтаром, які дадзен аб'яднаньням на час работы членам таварыства. Прасьцейшыя таварыствы наасобным пляцельшчыкамі падатку ня лічацца. Сельска-гаспадарчым падаткам абкладаюцца не таварыствы ў цэлым (як калгасы), а індывідуальныя гаспадаркі, якія ўваходзяць у склад таварыства.

Масавыя расправы фашызму ў Заходняй Беларусі

102 ГАДЫ КАТАРГІ

ВІЛЬНЯ, 20. У сакавіку г.г. адбыўся ў Горадні палітычны працэс над 51 беларускімі сялянамі Ваўкавыскага павету, якія абвінавачваліся фашысцкімі ўладамі ў «здрадзе дзяржаве» — у тым, што яны вялі падрыхтоўку да ўзброенага паўстаньня. Большасьць абвінавачаных ужо па некалькі год сядзяць у турме.

Абвінавачаныя захоўваліся ў часе працэсу з надзвычайным рэвалюцыйным гонарам. Штодзенна раніцою і вечарам, калі абвінавачаныя перавозіліся з турмы і назад, быў з турэмнай карэткі чуцён сьпеў «Інтэрнацыяналу».

У судовай залі абвінавачаныя выкрывалі зьверствы дэфізызвы і шпікоў, якія выступаюць у ролі сьведкаў абвінавачаньня. Кожны такі кат вітаецца выкрыкамі пратэсту з лавы падсудных.

Фашысцкі суд прыгаварыў 34 з ліку абвінавачаных. Абвінавачаныя Гэбэгны, Шэрашэўскі, Шапавал, Шарко засуджаны да 6 год катаргі, Абайхель — да 5 год, 14 абвінавачаных—да 4 год, двое — да 2 год, 13 — па годзе турмы.

Агулам фашысцкі суд прыгаварыў абвінавачаных да 102 год катаргі.

Сельска-гаспадарчы крызіс у Польшчы

Гніласьць капіталістычнай стабілізацыі, якая выявілася так выразна ў сусьветным эканамічным крызісе, асабліва рэзка выяўляецца ў такіх непасьпеўных замацавацца маладых краёх капіталу, як Польшча. У гэтым пераважна аграрным краі, у якім сялянства складае $^{3}/_{4}$ усяго насельніцтва, выдатную ролю ў разьвіцьці агульнага крызісу адыгрывае сельска-гаспадарчы крызіс.

Інтэнсыфікацыя польскае сельскае гаспадаркі, якая магла-б паслабіць зямельны голад і павялічыць ёмкасьць мізэрнага ўнутранога рынку, ня толькі не разьвіваецца, але нават зьніжаецца. Колькасьць штучнага ўгнаеньня, ужынанага ў сельскай гаспадарцы ўвосень 1929 г., значна памяншылася, а ўвесну 1930 г. чакаецца далейшае зьмяншэньне. Фабрыкі штучных угнаеньняў у Харкове і Мосьцічах (Зах. Галіцыя) загружаны толькі на 50%. А на фабрыку ў Мосьцічах, толькі нядаўна пабудаваную, патрачана 100 мільёнаў злотых (злоты — кал 22 кап.). Колькасьць праданых увосень 1929 г. сельска-гаспадарчых машын таксама значна зьменшылася.

Нажніцы паміж сельска-гаспадарчымі і прамысловымі цэнамі разбураюць сялянства. Параўнальна з 1927 г. — годам самых высокіх цэн—цэны на расьлінныя прадукты зьнізіліся на 50%, а прадукты жывёлаводзтва—на 20%. Між тым, цэны прамысловых тавараў зьнізіліся толькі на некалькі процантаў.

У зьвязку з крызісам памешчыкі дамагліся зьніжэньня і без таго нізкай зарплаты сельгасрабочых. Гадоча шырокіх колаў безьзямельных і малазямельных сялян расьце. Пралетарызацыя гэтых пластоў ідзе ўзмоцненым тэмпам. Вёска скарацілa свае патрэбы да мінімуму. Спажываньне цукру, якое да гэтага часу ўзрастала, у апошнія часы значна скарацілася. Збыт тканін вельмі нязначны. Затое нізвычайна ўзрасло спажываньне бульбы.

Зьбяднеьне вёскі адбіваецца на даяржаўных прыбытках. Апошнімі месяцамі даяржаўныя манаполіі (соль, тутун, сьпіртытус, запалкі) далі менш, чым у тым-жа пэрыядзе мінулага году. Мыты далі значна менш, чым было прадугледжана бюджэтам. Усё гэта прымусіла ўрад зьвярнуць увагу на стан сельскае гаспадаркі. Але ўсе яго мерапрыемствы ў гэтым напрамку ішлі па карысьць **толькі памешчыкам і кулаком.**

Восенью 1929 г. былі ўведзены ўвозныя мыты на хлеб і вызначаны прэміі на жыта, пшаніцу, ячмень, авёс і муку, а ў апошнія часы і на рад прадуктаў жывёлагадоўлі. Заключаны нядаўна (яшчэ не ратыфікаваны) польска-нямецкі гандлёвы дагавор таксама зьвязаны з імкненьнем ўраду зьмякчыць сельска-гаспадарчы крызіс, хаця нясумненна і падрыхтоўка адзінага супроцьсавецкага фронту адыграла тут значную ролю. Больш увагі зварачаецца на арганізацыю і пашырэньне сельска-гаспадарчага экспарту. **«Не даядаць, але вывозіць»— вось лёзунг аграрнай палітыкі фашысцкага ўраду Польшчы.** Зразумела, **не даядаюць працоўныя масы,** а буржуазія кладзе ў кішэню барышы, нажытыя на экспарце.

Парцэляцыя памешчыцкіх маёнткаў у цяперашні час амаль зусім прыпынена. Паводле афіцыйных даных, у 1929 г. былі парцэляваны толькі 163 тысячы гектараў супроць 222 тыс. у 1928 г. і 237 тыс. гэкт. у 1927 г. Прыём заяў па мэліяратыўныя крэдыты прыпынены дзяржаўным зямельным банкам ўжо ў сьнежні 1929 году. Камасацыя (зьнішчэньне цераспалосіцы), якая ўзмоцнена праводзіцца, не дае пажаданых фашысцкаму ўраду вынікаў — **узмацненьня кулака і багатага серадняка.**

Цяперашні сельска-гаспадарчы крызіс зноў ставіць у парадак дня такія пытаньні, як перадачу зямлі працоўным сялянам і надзел памешчыцкай зямлі бяз выкупу. Лёзунгі аб барацьбе з крэдытнай дэматовіяй фашызму, з фашысцкай камасацыяй, парцэляцыяй і мэліярацыяй, якія да гэтага часу ўспрымаліся, галоўным чынам, сялянскай беднатой, зараз становяцца ўжытымі для шырокіх серадняцкіх мас.

Выпадкі масавага супраціўленьня фашысцкаму зямляўпарадкаваньню робяцца ўсё больш і больш частымі. Паліцэйскі нэшэск ня спагнаньні падаткаў усё часьцей сустракае **адпор з боку сялян.** Вось як сельскі карэспандэнт фашысцкага «Пшэводнік Господарскі» апісвае валасны сход, скліканы фашысцкім валасным кіраўніцтвам для зацьвярджэньня бюджэту валасьці: «Хаця капітарысы складаюцца валасным кіраўніцтвам даволі асьцярожна, усё-ж сходы на палавіну скарачаюць выдаткі на ўтрыманьне школ, разьвіцьцё с.-г. культуры, аклады валасному старшыні і валасному пісару і г. д. Валаское праўленьне меркавала асыгнаваць пэўную суму на лігу супроцьгазавай і паветранай абароны. Сход ня прыняў гэтага выдатку, прычым чутны былі галасы: **«Няхай на нас пусьцяць гэтыя газы, няхай яны нас задушаць, навошта нам жыць, калі прыходзіцца так пакутаваць».** «Не забуду. — піша далей карэспандэнт, — такога выбуху нездаваленьня супроць пастановы валаснога праўленьня, якое ледзь ня было тут-жа разарвана за свой праект, хаця летась значна большая сума была зацьверджана без асаблівага супраціўленьня»...

Сацыял-фашысты і правадыры згодніцкіх сялянскіх партый сваімі ілжэ-анархічнымі манэўрамі стараюцца ўтрымаць масы ад змаганьня з фашысцкім рэжымам, якое вядзе кампартыя Польшчы і левыя сялянскія групоўкі.

Сацыял-фашысты і ППС прабуюць стаць на чале руху сельска-гаспадарчых рабочых, каб тым больш напэўна здрадзіць ім у самую рашучую хвіліну. Сярод працоўнага сялянства «подвизается» так званая «сялянская партыя» Домбскага, якая процістаўіць горад вёсцы, імкнучыся такім чынам скарыстаць крызіс для дыскрэдытаваньня ідэі рабоча-сялянскага саюзу, якая (ідэя) пусьціла карэньні ў масы польскага сялянства, аб чым сьведчыць сььяткаваньне ў вёсках 1-га мая. «Сялянская партыя» ў сваёй агітацыі зварачаецца да самай бессаромнай дэмагогіі, чым і тлумачыцца яе часовы посьпех, між тым, як ППС і «Вызваленьне»,—старэйшыя згодніцкія сялянскія групоўкі ў Польшчы, церпяць страты.

Для адцягненьня ўвагі сялянскіх мас ад крызісу згоднікі вядуць кампанію цкаваньня СССР. Пра калектывізацыю сельскае гаспадаркі ў СССР сялянскія згоднікі пашыраюць самыя недарэчныя чуткі і плёткі. Тое-ж самае робіцца і на пытаньні аб так званых «рэлігійных праследваньнях» у СССР. Ва ўсіх антысавецкіх кампаніях сялянскія згодніцкія партыі і сацыял-фашысты ідуць рука аб руку з буржуазіяй, памешчыкамі і духавенствам як каталіцкім, так і ўўрэйскім. Агітацыя гэта мае, зразумела, і іншую мэту: **адцягваючы ўвагу мас ад унутранога крызісу, яна імкнецца адначасова падрыхтаваць іх да нападу на СССР.** Ліхаманкавыя падрыхтаваньні да гэтага нападу ў сувязі з крызісам яшчэ больш узмацніліся.

Фашысцкая Польшча імкнецца знайсьці выхад з цяперашняга крызісу у ваеннай авантуры.

ЯНОЎСКІ.

Новыя перамогі камуністычных войск у Кітаі

ШАНХАЙ, 19. Газэты паведамляюць, што 5 тысяч камуністых захапілі рад гарадоў пагранічнай вобласьці правінцыі Чжанцзян і Цзянсі, у раёне Чаншан. Дывізія ўрадавых войск выступіла з Ханькоу ў раён Хуансі (на паўночны-усход Хубэйскай правінцыі) для задушэньня камуністычнага руху.

ІНТЭРВ'Ю САКРАТАРА МА ДЭ-ГУЯ

ТОКІЁ, 18. Паводле вестак з Харбіна, сакратар асабістай канцылярыі Ма Дэ-гуя даў па даручэньні апошняга інтэрв'ю прадстаўніком друку. У гэтым інтэрв'ю ён заявіў:

«Паведамленьне выходзячай у Дайрэне японскай газэты «Мансюміта», быццам савецкая адміністрацыя К.-У. чыг. пры наборы супрацоўнікаў падбірае і быццам СССР камандыраваў на К.-У. чыг. у якасьці служачых 1.000 вызначаных грамадзян, зьяўляецца абсалютна хлусьлівым».

САВЕЦКАЕ КОНСУЛЬСТВА Ў МУКДЭНЕ

ТОКІЁ, 18. Як паведамляюць з Харбіна, у Мукдэн прыехаў нова-назначаны савецкі консул **Знаменскі.** Консульства аднавіла працу.

Ангельскі ультыматум Эгіпту

ЛЁНДАН, 19. У сувязі з адтэрміноўкай ангельска-эгіпэцкіх перагавораў, якія адбываюцца ў Лёндане, калэспандэнт «Дэйлі Мэйль» паведамляе, што міністар замежных спраў **Гэндэрсон перадаў ультыматум эгіпацкай дэлегацыі.** Ва ультыматуме зазначаецца, што ўрад рабочай партыі ўжо сказаў сваё «апошняе слова» і ня можа пайсьці на далейшыя ўступкі ў перагаворах. Асноўныя рознагалосьці паміж Англіяй і Эгіптам узьніклі па пытаньні аб кіраваньні Суданам.

ПРЫГАВАР ПА СПРАВЕ „СВУ"

ХАРКАЎ. 19 ночу асобная калегія Вярхоўнага суда Украіны вынесла прыгавар па справе контр-рэвалюцыйнай арганізацыі «СВУ».

Прыгавар вызначае контр-рэвалюцыйную сутнасьць гэтай надпольнай арганізацыі, якая ставіла сабе мэтаю зьвяржэньне савецкай улады шляхам паўстаньня і інтэрвэнцыі.

У адносінах кіраўнікоў-ідэолёгаў СВУ Сяргея Яфрэмава, Нікоўскага, Уладзімера Чахоўскага, Дурдукоўскага і кіраўніка саюзу украінскай моладзі Паўлушкава суд прызнаў, што яны прадстаўляюць сабою надзвычайную небясьпеку, але, улічваючы іх пакаяньне, асуджэньне імі сваёй контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці, улічваючы, што іх падрабязныя паказаньні на папярэднім і судовым следзьце дапамагалі асьвятліць усю контр-рэвалюцыйную работу СВУ, суд прызнаў магчымым ня ўжыць да іх вышэйшай меры сацыяльнай абароны — расстрэлу. **Сяргей Яфрэмаў, Нікоўскі, Уладзімір Чахоўскі прыгавораны да 10 год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох на 5 год кожны. Паўлушкаў засуджаны да пазбаўленьня волі на 10 год з паражэньнем у правох на 3 гады.**

Дурдукоўскі, Ганцоў, Халодны, Барбар, Удавенка і Падгаецкі прыгавораны на 8 год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох на 3 гады.

Блізьнюк, Слабчанка і Іваніцкі—да пазбаўленьня волі на 6 год з паражэньнем у правох на 3 гады.

Гэрмайэз, Грабяніцкі, Стаманоўскі, Чарняўскі, Залескі, Валашкевіч, Валаззвіч, Пётр Яфрэмаў і Доўгуш—да пазбаўленьня волі на 5 год з паражэньнем у правох на 2 гады.

Старыцкая-Чарняхоўская—да 5 год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох на 3 гады.

Матушэйскі прысуджаны да пазбаўленьня волі на 5 год.

Маргуліс, Дуброўскі і Тарас Слабчанка—на 3 гады пазбаўленьня волі без паражэньня ў правох.

Батвіноўскі і Мікалай Чахоўскі—да пазбаўленьня волі на 3 гады з паражэньнем у правох на 2 гады.

Трэзьвінскі, Такарэўская, Шыло, Іўчэнка, Крывенюк, Туркало, Кудрэўскі, Беднова, Логуна—да 3-х год пазбаўленьня волі ўмоўна з выпрабавальным тэрмінам на 3 гады.

Дога, Дружкевіч, Шарко, Белы Шчапоцьцеў, Карповіч і Панчэнка прыгавораны да высылкі за межы Украіны на 3 гады.

Пазбаўленьне волі ўсіх засуджаных з суровай ізаляцыяй.

Усім засуджаным залічаны час, праведзены імі ў папярэднім заключэньні. Засуджаныя ўмоўна неадкладна вызвалены з-пад варты.

Прыгавар канчаткові і абскарджаньню не падлягае.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

УЗМОЦНІМ КЛЯСАВУЮ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ КАМСАМОЛУ

На першыя пазыцыі

Камсамол зьяўляецца бліжэйшым памочнікам партыі, ударным баявым атрадам па выкананьні аднэй з баявых рашаючых задач данага моманту—падрыхтоўкі і пасьпяховага праведзеньня веснавой засеўнай кампаніі.

Між тым вялікая частка арганізацый ЛКСМБ ў вёсцы паказала сябе далёка няўдарнай на гэтым вучастку работы. Кіраўніцтвы раду акругкомаў, райкомаў камсамолу (Магілеў, Ворша, Бабруйск, Грэск і інш.) ня здолелі мабілізаваць масы камсамольскай арганізацыі на бязьлітасную барацьбу за генэральную лінію партыі ў калгасным будаўніцтве. Гэтыя камсамольскія камітэты ў сваёй рабоце недаацэньвалі значэньня работы па арганізацыі беднаты і батрацтва, не мабілізавалі масы батрацка-бядняцкай моладзі і камсамольцаў на барацьбу з кулацтвам.

Бюро Магілеўскага акруткому камсамолу ў арыентацыі арганізацыі па ўдзеле ў веснавой засеўнай кампаніі правяло палітычную блізарукасьць, бызначыўшы, як галоўныя мерапрыемствы, збор попелу, ачыстку насеньня. У свой час бюро ЦК ЛКСМБ адзначыла правазапартуністычныя памылкі ў дзейнасьці Магілеўскага і Бабруйскага АК ЛКСМБ. І калі Бабруйская арганізацыя ўзялася за выпраўленьне памылак, дык магілеўскае камсамольскае кіраўніцтва ня толькі не мабілізавала ўвагі арганізацыі на выпраўленьне дапушчаных памылак, але да апошняга часу бараніла гэтыя памылкі. Сакратар Лупалаўскага райкому ЛКСМ дагаварыўся да таго, што заявіў: «Калі мы не вядзем работы з батрацка - бядняцкай моладзьдзю, дык мы-ж зьбіраем сходы сялянскай моладзі наогул». У тым-жа Лупалаўскім раёне была створана арганізацыя пад назвай «Чырвоная Мятла», члены якое, ня лічачыся з жаданьнем, з маемасным станам, забіралі насеньне ў сялянства. А гэты раён знаходзіўся ў двух-трох кілёмэтрах ад акруговага цэнтру. Былі моманты, калі ў радзе раёнаў Магілеўшчыны замест стварэньня ударных брыгад на надрыхтоўцы да веснавой сяўбы стваралися брыгады па забраньні царквы.

Пасьля апублікаваньня адозвы ЦК УсеКП(б) аб скажэньнях партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве, бюро Магілеўскага АК ЛКСМБ. замест таго, каб выправіць дапушчаныя памылкі, каб правесьці растлумачальную работу ў арганізацыі — вынесла пастанову «склікаць зараз-жа пленум райкому». На гэтым і спынілася растлумачэньне.

У выніку такога кіраўніцтва мы маем такое становішча, што Магілеўская арганізацыя і да сёньняшняга дня яшчэ не пераключыла, як належыць, сваёй энэргіі у работу на калгасным будаўніцтве, па правядзеньні веснавой сяўбы.

Матар'ялы раёнаў іншых акруг кажуць. што цяперашняя работа ў вёсцы многімі камсамольскімі ячэйкамі праводзіцца без належнага разуменьня яе палітычнай сутнасьці. Большасьць камсамольскіх камітэтаў не правяла выстарчальнай растлумачальнай работы па пытаньнях калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва на базе суцэльнай калектывізацыі. Адсюль вынікала шмат скажэньняў у практычнай рабоце ячэек. У Нараўлянскім, напрыклад, раёне некаторыя камсамольцы адмовіліся весьці працу па раскулачваньні таму, што «шкада чалавека».

У радзе камсамольскіх арганізацый яшчэ і дагэтуль не ўсьвядомлена палітычнае значэньне работы па арганізацыі батрацтва і беднаты. У гэтай справе — значны прарыў. І да гэтага часу ў большасьці акруг не адбылося яшчэ сур'ёзнага зруху ў галіне росту за кошт батрацтва і беднаты, што зьяўляецца адным з асноўных паказальнікаў невыкананьня простых указаньняў ЦК УсеКП(б) аб рабоце з беднатой і батрацтвам і няўменьня замацаваць актыўнасьць працоўнай моладзі.

Камсамольскія арганізацыі вёскі не перабудаваліся, каб сапраўды павярнуцца тварам да калгасу. Гэта перабудова адбываецца марудна і часта зводзіцца да замены толькі назвы з вясковай ячэйкі ў калгасную.

Трэба ўзмацніць партыйнае кіраўніцтва камсамольскімі арганізацыямі. Ня гледзячы на рад партыйных пастаноў, парткіраўніцтва ў асобных мясцох надавучай слабое, часта зводзіцца да фармальнага прадстаўніцтва партпрымаванага ў камсамольскай ячэйцы. Аснoўная задача заключаецца ў тым, каб мабілізаваць увагу ўсёй камсамольскай арганізацыі на барацьбу за генэральную лінію партыі, накіраваць агонь барацьбы на правы ўхіл, як асабліва небясьпечны на даным этапе, узмацніўшы барацьбу з «левымі» загібамі ў калгасным будаўніцтве. Трэба рашуча выправіць зробленыя памылкі, якія ёсьць у радзе камсамольскіх арганізацый у рабоце па вёсцы. Неабходна разгарнуць барацьбу з маючай месца замляналасьцю з боку асобных камсамольцаў, дабіўшыся таго, каб кожная ячэйка ў вёсцы стала на чале актыўнай дапамогі партыі ў замацаваньні калгасаў, у далейшым разгортваньні калгаснага будаўніцтва, у барацьбе з перагібамі. Неабходна паставіць на належную вышыню сыстэматычную работу ка арганізацыі беднаты і батрацтва, без чаго немагчыма правядзеньне справы калектывізацыі, ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Усе арганізацыі камсамолу павінны быць на перадавых пазыцыях.

С.

Перабудоўваюцца фармальна

У Віцебскім вясковым раёне адмоўным бокам у рабоце камсамольскай арганізацыі зьяўляецца нежаданьне асобных камсамольцаў працаваць з масамі: «Не магу праводзіць працы па калектывізацыі, каб не падарваць свайго аўтарытэту»—так заяўляюць некаторыя камсамольцы. Нядаўна 8 камсамольцаў былі выключаны з камсамолу за адмаўленьне застацца ў калгасе. У Пліскай ячэйцы былы сакратар падаў заяву аб выходзе з калгасу, матывуючы тым, што ня хоча грабіць бацькаву гаспадарку. У гэтай-жа ячэйцы бюро выдала спраўку кулаку аб яго палітычнай надзейнасьці. У Сінцкай ячэйцы некалькі камсамольцаў падпісаліся за вызваленьне кулака ад раскулачваньня. Ячэйка не рэагавала своячасова на гэтыя апартуністычныя дзеяньні.

Райком камсамолу лічыць, што камсамольская арганізацыя здавальняюча перабудоўваецца паводле вытворчага калгаснага прынцыпу. Райком пры гэтым спасылаецца на тое, што на 1-II 1930 году было калгасных ячэек 4, а на 1-IV—15 калгасных ячэек і 2 камсамольскія калектывы, у якія ўваходзіць 4 цэх'ячэек. Але гэта ў асноўным толькі фармальная перабудова, толькі зьмена назваў. Зьмест працы застаецца ў ячэйках стары. Праўда, прыкладна працуе Старасельскі калектыў камсамолу. Ён утварыў пры цэхавых ячэйках вытворчыя нарады, ударныя брыгады камсамольцаў і моладзі, якія праводзяць усю работу па надрыхтоўцы да веснавой сяўбы ў адным з калгасаў. Гэта-ж брыгада вяла актыўную барацьбу з кулакамі ў той час, як пад кулацкім уплывам частка сялян падала заявы аб выходзе з калгасу. Гэта брыгада пастанавіла правесьці шырокую кампанію па растлумачэньні ільгот калгаснікам, артыкулу т. Сталіна «Адказы таварышом калгаснікам». Шэсьць асоб з гэтай брыгады падалі заявы аб прыняцьці ў камсамол.

Віцебскі.

Дзе канкрэтнае кіраўніцтва

У Капаткевіцкім раёне, Мазырскай акругі, у выніку скажэньняў лініі партыі ў справе калектывізацыі і раскулачваньня, значна зьніжаўся процант калектывізацыі. Масавая работа па растлумачэньні адозвы ЦК УсеКП(б) па пытаньнях калгаснага будаўніцтва і артыкулу Сталіна была пастаўлена вельмі слаба. Камсамольская арганізацыя і да гэтага часу займае пейкае «нейтральнае» становішча. Многія ячэйкі, асабліва камсамольцы, не правялі ніякай работы, каб зрабіць уплыў на бацькоў, якія выходзяць з калгасаў. На чыншы камсамольцы ў калгасах заставаліся, фактычна нічога ня робяць па замацаваньні калгасаў, па надрыхтоўцы да сяўбы, пераводзе на новы статут сельска-гаспадарчай арцелі.

Аб становішчы перабудовы Капаткевіцкай вясковай камсамольскай арганізацыі можа сьведчыць факт фармальных адносін да гэтай справы самога бюро РК ЛКСМБ. Вось выпіска з пратаколу ад 10-га красавіка: «Слухалі: аб перайменаваньні Колкаўскай ячэйкі ў калгасную. Ухвалілі: улічваючы, што Колкаўскі сельсавет перайшоў на суцэльную калектывізацыю і ўсе члены ЛКСМ записаліся ў калгас, а таксама падано 15 заяў аб прыняцьці ў камсамол, а таму, выходзячы з вышэйпаказанага, перайменаваць Колкаўскую ячэйку ў калгасную «Чырвоны Арацьбы».

Вось як разумеюць капаткевіцкія кіраўнікі значэньне перабудовы камсамольскіх арганізацый «тварам да калгасу». Трэба, бачыце, толькі «перайменаваць». Такое разуменьне перабудовы блазнюўка створаецца і ў ячэйках. Так, у калгасе «Перамога», дзе 75 проц. камсамольцаў-калгаснікаў і дагэтуль ячэйка, хаця і мае назву «калгасная», але ніякага ўдзелу ня прымае ў вытворчым жыцьці калгасу.

Ячэйкі ня ведаюць, як ім перабудоўвацца. А сакратар РК, які сядзеў паўтара месяца ў вёсны Лучыцкага сельсавету, праводзіў работу сярод сялян і ні разу не пагаварыў нават з сакратаром мясцовай камсамольскай ячэйкі аб перабудове работы ячэйкі.

Трэба на такім кіраўніцтве ўдарыць.

Ш.

З лістоў рабкораў

На партыйных ячэйках

◎ У апошнім часе партыйная ячэйка **майлевай фабрыкі імя Хапутрына (Бабруйск)** вусім слаба працуе. Ячэйка ня цікавіцца вытворчым жыцьцём прадпрыемства. Няма ніякага кіраўніцтва ўдарнымі брыгадамі. Запінала работа та вытворчых нарад. На фабрыцы нават чакаю старшыні вытворчай нарады. Слаба праводзіцца культурна - масавая работа, на што ячэйка не рэагуе.

С.

◎ Бюро ячэйкі **будаўнікоў (Мазыр)** нядбайна адносіцца да залу рабочых аб прыёме ў партыю. На працягу доўгага часу бюро не разглядае многіх заяў ад рабочых. Іншыя рабочыя, жадаючы ўступіць у партыю, ня хочуць падаваць заявы, бо, як яны гаворыць, «усё роўна заявы трапяць пад сукно».

Б.

◎ Парт'ячэйка фабрыкі **«Чырвоны Кастрычнік» (Менск)** ня выконвае прапаноў дзяржаркому. Камісія па чыстцы запрапанавала ячэйцы ўзмацніць кіраўніцтва спаборніцтвам і ўдарнымі брыгадамі і зьвярнуць самую сур'ёзную увагу на пытаньні вытворчага зьяцьця прадпрыемства. Але ячэйка прайшла міма прапаноў камісіі па чыстцы. Перапрэйнаму ячэйка амаль нічога ня робіць па барацьбе за прамфінпляны. Зусім ня дзіва, што на фабрыцы мае месца прарыў у выкананьні прамфінпляну.

◎ Па **Мсьціслаўскай** партарганізацыі (Аршанчына) шырока разгарнулася спраўздача - перавыбарчая кампанія бюро ячэек. Перавыбары паказалі, што партыйная работа ў некаторых ячэйках пастаўлена вельмі кепска. У цэлым радзе ячэек за апошнія месяцы ня толькі ня было ніякай практычнай работы, але нават не склікаліся агульныя сходы ячэек і пасяджэньні бюро.

Б.

◎ **Запінейны РК КП(б)В** даў дырэктыву ўсім ячэйкам прыступіць да праверкі наколькі рабочыя - камуністы, зьвязаныя з сельскай гаспадаркай, прымаюць удзел у калгасным будаўніцтве. Партканцэлярыі заводу імя Ланцуцкага ня выконвае гэтай дырэктывы. Між тым, на заводзе працуе вельмі многа камуністых, якія цесна зьвязаны з сельскай гаспадаркай. Большасьць гэтых партыйцаў яшчэ ня ўступілі ў калгасы.

◎ Бюро ячэйкі **шчотачнай фабрыкі імя Крупскай (Менск)** нядбайна і няўважліва адносіцца да прыёму ў партыю. Нядаўна бюро прыняло ў партыю некалькі такіх рабочых, якім ні ў якім разе ня месца ў радох КП(б)В. Падаю факты. Прынятая папрыклад, у партыю работніца Рэсіна находзіць з чужых нам элементаў і падтрымлівае цесную сувязь з сваімі бацькамі, якія пазбаўлены права голасу. Прыняты ў партыю таксама Савінскі. Ён у мінулым быў выключаны з камсамолу за растрату, займаўся мацюкоствам і г. д.

РАБКОР.

21-га красавіка ў памяшканьні Менскага АК ЛКСМБ адбудзецца пасяджэньне журы па прысуджэньні пераходнага сьцягу.

На парадку дня стаяць даклады аб выкананьні прамфінпляну дырэктароў наступных прадпрыемстваў:

1. Завод „Камунар", 2. Друкарня імя Сталіна, 3. Завод „Дрэваапрацоўшчык", 4. Фабрыка „Кастрычнік", 5. Белдзяржбуд, 6. Менбудтрэст.

Пасьля абмеркаваньня дакладаў аб выкананьні прамфінпляну будуць заслуханы судаклады сакратароў камсамольскіх калектываў гэтых прадпрыемстваў.

Фрунзаўскі РК ЛКСМБ.

Да адкрыцьця Турксібу

Дэлегацыя на змычку Турксібу

20-га красавіка хутчэй цягнікам з Масквы ў Айна-булак выехала дэлегацыя з прадстаўнікоў савецкіх, прафсаюзных і іншых арганізацый на ўрачыстую змычку паўночнага і паўднёвага вучасткаў Туркестана—Сібірскай чыгункі. На сёньняшні дзень на паездку запісалася 130 чалавек. Сярод іх т. КАТАЯМА, 26 ЧАЛАВЕК АД ПРАФСАЮЗАЎ, МОСПС, 4 ЧАЛАВЕКІ АД ЦК БУДАЎНІКОЎ, 30 ЗАМЕЖНЫХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ, ПРАДСТАЎНІКІ АД УСІХ МАСКОЎСКІХ ГАЗЭТ І УКРАІНСКАЙ ПРЭСЫ, АД ДНЕПРАБУДУ, ТРАКТАРАБУДУ, МАЛДАЎСКАЙ АЎТАНОМНАЙ РЭСПУБЛІКІ і інш.

ШТО ДАСЬЦЬ ТУРКСІБ

Пастанова Савету Працы і Абароны СССР **аб пачатку пабудовы Туркестана-Сібірскай чыгункі вынесена 3-га сьнежня 1926 г.**

Тэрмін выкананьня пабудовы назначаны пяцігадовы, г. зн. да 1930-31 г. **Сканчэньне пабудовы да мая 1930 г. азначае выкананьне пяцігадовага пляну пабудовы менш чым за 4 гады.**

Турксіб, злучаючы Сібір з Сярэдняй Азіяй, забясьпечвае апошнюю **танным хлебам з бліжэйшых раёнаў (Сібір, Казакстан і Кіргізія). Тым самым новая чыгунка рашуча ўплывае на разьвіцьцё бавоўнаводзтва ў Сярэдняй Азіі, якая зьяўляецца асноўнай сыр'цовай базай нашай бавоўняна - папяровай прамысловасьці.**

Разьвіцьцё ўласнага бавоўнаводзтва **вызваляць Савецкі Саюз ад неабходнасьці закупаць замежную бавоўну,** на што кожны год выдаткуецца звыш 100 млн. руб. валюты.

Хлеб з Сібіры, дастаўлены па Туркестана-Сібірскай чыг., будзе каштаваць **на 12-14 млн. руб. таней, чым цяпер.**

Па патаненьні перавозак у Сярэднюю Азію лесу, жывёлы, мяса і некаторых іншых прадуктаў, а таксама перавозак прамтавараў у раёны самой чыгункі, **атрымаецца эканомія мінімум у 6-7 мільёнаў рублёў у год.**

Прыкладна **15 млн. рублёў** атрымаецца ў год выгады ад **патаненьня кошту бавоўнянага валакна,** дзякуючы забясьпячэньню бавоўняных раёнаў больш танным хлебам і іншымі с.-г. прадуктамі.

Усе ўкосныя выгады ад Туркестана-Сібірскай чыгункі па самых простых разьлівах будуць вылічацца ў год ня менш чым у 50 млн. руб.

На працягу каля 1.000 кілёмэтраў Турксіб

Брак б'е па рэальнай зарплаце

ШВЭЙНАЯ ФАБРЫКА „ПРАФІНТЭРН" У ВІЦЕБСКУ, АБУТКОВАЯ Ф-КА Ў МЕНСКУ, „ДНЯПРОЎСКАЯ МАНУФАКТУРА" І ГУТА ІМЯ ДОМБАЛЯ ВЫПУСКАЮЦЬ ДРЭННУЮ ПРАДУКЦЫЮ.

За апошні час асабліва кідаецца ў вочы значнае пагоршаньне якасьці прадукцыі швэйнай, абутковай і тэкстыльнай прамысловасьці БССР. Трывожныя весткі аб дрэннай якасьці прадукцыі з кожны дзём прымаюць больш пагражаючыя разьмеры.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦКК-РСІ, дзе абмяркоўвалася пытаньне аб праверцы выкананьня нашымі прадпрыемствамі пастановы Савету Працы і Абароны аб паляпшэньні якасьці прадукцыі, былі прадэманстраваны экспанаты дрэннай якасьці і адзначаны нядбайныя адносіны майстроў і бракоўшчыкаў да сваіх абавязкаў.

Тут мы маем прадукцыю Менскай абутковай фабрыкі. Абутак вырабу гэтай фабрыкі калечыць ногі, ад абутку на другі-трэці дзень часта адвальваецца падэшва, або адвальваюцца перадкі, неаднолькавыя разьмеры аднае і тае пары.

Перад намі экспанаты Віцебскай швэйнай фабрыкі «Прафінтэрн». Жаночае паліто, з добрага сукна, настолькі звужана, што ня ўзьлезе і на 10-гадовую дзяўчынку. Мужчынскія гарнітуры спалены жалязкам. Дзесяткі гарнітураў з добраякаснага матар'ялу сапсаваны і забракаваныя.

Тут мы маем і экспанаты вырабу Дубровенскай «Дняпроўскай Мануфактуры» — здзін і той-жа кусок тэкстылю мае накальні колераў, недатканыя вырабы, якія рассыпаюцца ў руках.

А вось экспанаты шкіпяной экспартнай прамысловасьці з заводу імя Домбаля, які выпускае на рынак неашліфаваныя шкляныі, аб якія спажывец раніць свае губы.

Да ўсяго трэба дадаць, што ўвесь гэты брак і прадукты дрэннай якасьці выпускаюць на рынак, як першагатункавы тавар. Усё гэта, бязумоўна, падрывае аўтарытэт каапэрацыі ў вачох спажыўцоў.

Кепская якасьць прадукцыі больш усяго тлумачыцца суб'ектыўнымі прычынамі: нядбайнасьцю і несьвядомасьцю некаторых рабочых швэйнай, абутковай і тэкстыльнай прамысловасьці, злосьлівымі і нядбайнымі адносінамі майстроў і бракоўшчыкаў да сваіх абавязкаў.

Становішча, якое мы зараз маем з пагаршэньнем якасьці прадукцыі, прымушае нас біць трывогу і сканцэнтраваць на ім грамадзкую думку, бо яно зьніжае рэальную заработную плату рабочых-спажыўцоў і павялічвае таварны голад.

У той час, калі партыя ставіць задачу аб павышэньні рэальнай заработнай платы рабочых, дрэнная якасьць прадукцыі наадварот намяшчае яе, бо гатовую тавратку прыходзіцца перапрываць. —абутак рвецца на другі-трэці дзень і ў сувязі з дэфіцытнасьцю падэшваў. рабочы прымушаны зноў купляць новы абутак.

ВСНГБ, Наркамгандаль, Белкаапсаюз мала зрабілі для таго, каб мабілізаваць увагу грамадзкасьці вакол якасьці прадукцыі. Яны не дэманстравалі гэтыя экспанаты перад самімі рабочымі, якія выпускаюць дрэнную прадукцыю. Прафсаюзы стаяць у баку ад тае важнейшае палітычнае задачы, ад якой залежыць узьнятьце рэальнай заработнай платы рабочых.

Брак і псаваньне прадукцыі за апошні час прынесьлі вялікія страты дзяржаве. І гэта, бязумоўна, яшчэ больш павялічвае таварны голад.

Меры дысцыплінарнага спагнаньня ў адносінах тых, якія зласьліва псуюць прадукцыю, былі недастаткова жорсткімі. Прафсаюзы часта перашкаджалі адміністрацыі ўжываць меры спагнаньня да тых, хто нядбайна адносіцца да сваёй работы, да тых рабочых, якія прыносяць страту дзяржаве выпускам нядобраякаснай прадукцыі.

Інжынэрна-тэхнічны пэрсанал таксама не мабілізаваны на барацьбу з бракам і дрэннай якасьцю прадукцыі.

Пагражаючыя весткі аб якасьці прадукцыі прымушаюць зараз ВСНГБ, Наркамгандаль і Белкаапсаюз ужыць самыя рашучыя меры да зьніжэньня гэтага ганебнага зьявішча, да павышэньня вытворчай дысцыпліны на прадпрыемствах, прымяняцца больш жорсткіх мер адміністрацыйнага спагнаньня да вінаватых у браку і псаваньні прадукцыі.

Прафсаюзным арганізацыям неабходна разгарнуць шырокую кампанію сярод рабочых па пытаньні паляпшэньня якасьці прадукцыі і вытворчай дысцыпліны.

Трэба мабілізаваць увагу адміністрацыйнага пэрсаналу і інжынэрна-тэхнічных сіл рэспубліканскай, мясцовай і саматужнай прамысловасьці на барацьбу з бракам, за павышэньне якасьці прадукцыі.

Трэба мабілізаваць увагу нізавога друку (фабрычна-заводзкіх насьценгазэт, друкаваных шматаразак), рабкораў і насьценкораў на шырокае штодзеннае асьвятленьне ў газэтах аб становішчы якасьці прадукцыі на тэй ці іншай вытворчасьці.

ЦУДЗІН.

За баявыя тэмпы беларусізацыі

(На пасяджэньні цэнтральнай нацкамісіі ЦВК БССР)

19-га красавіка адбылося пасяджэньне нацкамісіі пры ЦВК БССР. Разглядалася пытаньне аб беларусізацыі БВА і рэарганізацыі акруговых нацкамісій.

Прадстаўнік палітпраўніцтва БВА т. Хлусевіч і інструктары нацкамісіі, якія рабілі агляд становішча беларусізацыі ў часьцях БВА, канстатавалі, што нацпалітыка асноўнай масы чырвонаармейцаў і начскладу ўсьвядомлена правільна. Ужо няма тых поглядаў і разважаньняў, што беларусізацыя шкодзіць баяздольнасьці чырвонаармейцаў. Паасобныя выпадкі антысэмітызму і павінізму, якія молі месца, знаходзілі ранучы адпор з боку чырвонаармейскай масы. Аднак, ёсьць і недахопы. АБВШ, якая зьяўляецца кузьняй маладых кадраў, выпускае курсантаў, якія не даволі добра падкаваны на пытаньнях нацыянальнай палітыкі партыі. Беларусізацыя тае ці іншае часткі абмяжоўваецца толькі вывучэньнем беларускае мовы, без дакладнага вывучэньня эканомікі, культуры і гісторыі Беларусі, не дзявядае задачам беларусізацыі. Вельмі часта да беларусізацыі падыходзяць фармальна. Асабліва дрэнна стаіць справа ў тых часьцях, дзе процант беларусоў меншы, чым іншых нацыянальнасьцей. Ёсьць факты, калі на цэны полк выпісваецца ўсяго 1-3 экз. «Зьвязды», якіх амаль што ніхто ня чытае. Такое становішча залежыць у значнай меры ад грамадзкіх арганізацый, якія ў сваёй рабоце часта ігнаруюць пытаньні беларусізацыі і нацыянальнай палітыкі партыі.

Для нармальнай работы не хапае самых патрэбных падручнікаў на беларускай мове. Беллдзяржвыдавецтва зарымлівае пераклад і выпуск літаратуры, прапушчанай РВС. Статут палявой службы і да гэтага часу не перакладзены на беларускую мову. Асобныя камандзіры перакладаюць яго самі, праз што ён ня мае пастаяннай тэрміналёгіі.

Акадэмія Навук бярэцца за гэту справу, але патрабуе занадта вялікую цану за кожны перакладзены тэрмін.

Нацкамісія дала дырэктыву зьяўляць вынэйпаказаныя недахопы ў самы кароткі тэрмін. Для выпрацоўкі канкрэтных мерапрыемстваў выбрана спэцыяльная камісія.

Цэнтральная нацкамісія лічыць патрэбным арганізаваць нацкамісію ў тых акругах, дзе іх няма, і рэарганізаваць існуючыя. Акруговая нацкамісія павінна зьяўляцца пастаянным органам пры АВК і падначалена яму. У функцыі акруговай нацкамісіі ўваходзіць ужываньне захадаў да далейшага разьвіцьця і пашырэньня беларускае пралетарскае культуры, гаспадарчае і культурнае абслугоўваньне нацыянальных меншасьцей. Нацкамісіі павінны сачыць за выкананьнем дырэктыў партыі і ўлады ў адносінах ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі партыі, павінны весьці барацьбу з антысэмітызмам і павінізмамі, наогул вырашаць пытаньні ў акрузе, зьвязаныя з нацыянальнай палітыкай.

На нарадзе быў выпрацаваны плян работы нацкамісіі ЦВК на 6 месяцаў. У плян уваходзіць: вывучэньне новых нацыянальных саветаў; апрацоўка мерапрыемстваў на аздараўленьні становішча мястачковага насьельніцтва; праверка нацыянальнага складу навуковых устаноў; абсьледаваньне гарадзкой беднаты нацыянальных меншасьцей БССР; вырашэньне пытаньня аб уссагульным навучаньні нацыянальных меншасьцей БССР і інш.

Б. ЗАХАШЧ.

Усебеларуская сельска-гаспадарчая і прамысловая выстаўка

Хроніка выстаўкі

— Спэцыяльная камісія выявіла, што з апошнія дэ тыдні тэмп будаўніцтва усебеларускай с.-г. прамысловай выстаўкі значна паменшыўся, што не гарантуе сканчэньня будаўніцтва ў вызначаныя тэрміны. Белдзяржбуд ня прымае ніякіх мер да фарсаваньня будаўніцтва. Каб скончыць выстаўку ў тэрмін, Белдзяржбуду трэба павялічыць колькасьць рабочых на будаўніцтве ў 5 раз.

— «Зьвязда» ўжо сыгналізавала аб тым, што пажарная ахова на выстаўцы арганізавана вельмі дрэнна. Але дасюль руху ў гэтай справе няма. Начальнік гарадзкой пажарнай каманды т. Казанка заявіў дырэкцыі, што арганізаваць пажарную каманду для аховы выстаўкі немагчыма, бо на біржы працы няма людзей. На арганізавана таксама ахова выстаўкі з боку міліцыі. На тэрыторыі выстаўкі ўсяго адзін міліцэйскі пост.

— У Менск працягваюць паступаць экспанаты, галоўным чынам, для зямлеробчага і пяснога павільёнаў, ужо паступіла звыш 3.300 экспанатаў. З Масквы прыбылі некторыя экспанаты для павільёну мэханізацыі і электрыфікацыі.

— Заключана ўмова з маскоўскімі мастакамі аб афармленьні павільёну мэханізацыі і электрыфікацыі і нарысаваньні дыяграм і картаграм. Работа павінна быць скончана да 15-га чэрвеня.

— Мастацкі савет ухваліў мадэль помніка трыбуны Леніна, які будзе пастаўлены на тэрыторыі выстаўкі. Мадэль зроблены скульптарам Грубэ. Вышыня галоўнай мачты помніка трыбуны 22 мэтры, а стаўп—7 мэтраў.

— Дырэкцыя выстаўкі перадала амэрыканскім і шведзкім фірмам заказ на абсталяваньне для мэханізаванага скотнага двара. Частка абсталяваньня заказана менскаму заводу «Камунар».

— У чэрвені чакаецца атрыманьне ад нямецкіх і шведзкіх фірм першых экспанатаў на выстаўку.

— З усесаюзнай прамысловасьці на ўсебеларускай с.-г. выстаўцы прымуць удзел пяць найбольш буйных гаспадарчых аб'яднаньняў — хэмічнае, мэталюргічнае і інш. аб'яднаньні.

Птушніцкія гаспадаркі... бяз птушак

Беларускі малочна-жывёлагадоўчы саюз павінен быў арганізаваць у калгасах 50 птушніцкіх гаспадарак, з іх 25 племянных па 300 курэй у кожнай і 25 прамысловых—па 3.000 курэй у кожнай.

На сёньняшні дзень лічыцца арганізаванай па ўсёй БССР 41 птушкаводная гаспадарка. Пры бліжэйшым - жа знаёмленьні з імі выяўляецца, што большасьці гэтых птушкаводных гаспадарак няма і трэці патрэбнай колькасьці птушак.

У Менскай акрузе, напрыклад, арганізавана 18 гаспадарак з агульным лікам птушак у 3.722 штукі, у Магілёўскай акрузе арганізаваны 4 гаспадаркі з 1.028 птушкамі, у Бабруйскай акрузе—11 гаспадарак з 551 птушкай і г. д.

У птушніцкіх-жа гаспадарках некаторых округ (Полацкая, Мазырская)... зусім няма піводнай птушкі.

Па воднай птушцы павінны былі быць арганізаваны ў Віцебскай і Полацкай округах па аднэй гаспадарцы. Да гэтага часу заданьне выканана.

Плянам вызначалася абсталяваць усе 50 птушніцкіх гаспадарак інкубатарамі. Закуплена-ж усяго 25 інкубатараў на 606 яек кожны. Быў закуплен таксама адзін інкубатар на 11.000 яек, але ён ня мог быць скарыстаны ў калгасе... «з прычыны адсутнасьці адпаведнага памяшканьня».

Не пачата таксама пабудова брудэргаўзаў (памяшканьні для вырошчваньня куранят).

Такім чынам, зараз гаварыць сур'ёзна аб арганізацыі птушніцкіх гаспадарак у беларускіх калгасах ня прыходзіцца, пя гледзячы па тое, што ў нас ёсьць усе прадпасылкі для разьвіцьця гэтай галіны сельскае гаспадаркі.

М—аў.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

ГЛУШЫЦЕЛІ РАБОЧАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Гаспадарнікі фабрыкі „Гэрой Працы" зрываюць сацспаборніцтва

Ініцыятыва рабочых у сацыялістычным спаборніцтве і паляпшэньне працэсаў вытворчасьці патрабуе ад кожнага адміністрацыйна - тэхнічнага работніка, ад кожнага гаспадарніка ўменьня арганізаваць гэту ініцыятыву, накіраваць яе па шляху выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

Якую ацэнку можна даць рабоце адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу Добрускай папяровай фабрыкі «Гэрой Працы»? Вось некалькі фактаў, якія, на нашай думцы, дапамогуць чытачу самому вырашыць гэтае пытаньне.

У рольным аддзеле 6 рабочых (з іх 1 партыец і 2 камсамольцы) узялі на сябе абавязак павялічыць выпрацоўку і адначасова зьменшыць колькасьць рабочых на аднэй машыне да 3-х чалавек замест 4. Прычым гэтыя рабочыя кінулі выклік усім іншым пасьледаваць іх прыкладу. Не пасьпелі рабочыя фабрыкі разабрацца ў гэтым новым вопыце работы, як адміністрацыя фабрыкі пасьпяшылася зьняць у гэтым аддзеле 13 чалавек, у тым ліку аднаго ініцыятара выкліку і загадам прапанавала перайсьці на новы мэтад работы, гэта значыць, на кожнай машыне па 3, а не па 4 чалавекі. Зразумела, што гэты загад выклікаў абурэньне рабочых і нават тых, хто быў ініцыятарам выкліку. Невыстарчальная прапрацоўка пытаньня ў парадку сацспаборніцтва дала магчымасьць адсталым элементам патрабаваць прыпыненьня работы машын, або звароту зьнятых з работы загадам рабочых. Такі-ж факт меў месца і на папяровых машынах.

У гэтым выпадку адміністрацыя дапусьціла адну крайнасьць. А вось факт, калі адміністрацыя ўдарылася ў другую крайнасьць.

4 рабочыя надумаліся паменшыць колькасьць рабочых ля галяндраў на палову: замест 8 чал. працаваць 4, калектыўна. Адміністрацыя, ня выпучыўшы пытальня, пачала даводзіць немагчымасьць такога мерапрыемства. І толькі пад націскам партыйнай і прафесыянальнай арганізацыі нарэшце пасправаваць. І калі рабочыя пусьцілі учатырох машыну, іх пачалі вінаваціць у шкурніцтве і парушэньні працдысцыпліны. У выніку гэтыя 4 ўдарнікі падалі заяву аб выхадзе з ударнай брыгады.

Ня ў большай пашане знаходзіцца і рабочае вынаходніцтва. Прапанова рабочага Драздова абмяркоўвалася на працягу году. Прапанова абышла ўсе адпаведныя і неадпаведныя ўстановы і толькі пад націскам райкому партыі была праведзена ў жыцьцё. Хтосьці надлічыў, што прапанова Драздова павінна даць 10.000 рублёў эканоміі. Тады тав. Драздоў атрымаў прэмію. Здавалася, усё добра. Але ўдасканаленьне тае, Драздова ўжывалі каля году і потым аднамноўваць ваду, за што ім плацяць па 25 руб. А ажыцьцявіць прапанову рабочых аб устаноўцы помпы ніхто і не падумае.

З працдысцыплінай таксама дрэнна. Ня гледзячы на рост парушэньняў працдысцыпліны, адміністрацыя глядзіць на ўсё скрозь пальцы. Горкія п'яніцы (Чайко, Крыса, Царэшчанка і інш.) за сыстэматычныя прагулы і прыход на работу ў п'яным вытрэзьлае на два разы звальніліся і зноў прымаліся на работу. Так адміністрацыя выконвае закон аб узмацненьні працдысцыпліны.

А вось некалькі фактаў аб адзінаначальні. Прыноў рабочы Казлоў на работу п'яным, дык майстар Закалінскі замест таго, каб налажыць на яго спагнаньне, дае яму пропуск да доктара.

Згарэў падшыпнік на новай устаноўцы 6-й папяровай машыны — склалі акт. Намесьнік дырэктара дае загад галоўнаму мэханіку налажыць спагнаньне на змазчыка, мэханік перадае загад загадчыку сілавое станцыі, а заг. сілавое станцыі падае рапарт заводакіраўніцтву з просьбай налажыць спагнаньне на змазчыка, а потым выяўляецца, што змазчык зусім не вінаваты. У выніку вінаватага не знайшлі.

У часе справаздачнай кампаніі перад перавыбарамі фабкому, калі прафработнікі і райком партыі гаварылі ўвагу рабочых на недахопы работы фабрыкі, адміністратары выступілі ў ролі абаронцаў рабочых ад прафсаюзу. У адказ на выступленьне старшыні ЦК саюзу, намесьнік дырэктара і загадчык вытворчасьцю, пры маўклівых адносінах дырэктара, заявілі: «Навошта вы крычыце. Мы прамфінплян выконваем».

Калі прафработнікі паказваюць на недахопы на ахове працы, адміністратары лічаць такія пытаньні драбніцамі.

І вось як можна ацаніць такія адносіны гаспадарнікаў да вытворчасьці? Усё разам узятае — кансэрватызм, безгаспадарчасьць, бюракратычны запіск рабочай ініцыятывы, адміністраваньне ў сацспаборніцтве, недаацэнка рабочага вынаходніцтва і рацыяналізацыі, патураньне прагульшчыкам і п'яніцам і г. д. — сьведчыць аб тым, што гаспадарнікі не ўсьвядомілі сваіх задач, не перабудавалі сваёй работы ў адпаведнасьці з патрэбнымі тэмпамі выкананьня пяцігодкі, не ўсьвядомілі поўнасьцю генэральнай лініі партыі.

Пагроза зрыву выкананьня прамфінпляну на Добрускай фабрыцы «Гэрой Працы» ня зьнята з парадку дня. Гаспадарчае кіраўніцтва фабрыкі не гарантуе выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

ВАЛЮКЕВІЧ, ГНІЛЯКЕВІЧ.

Чаму спазьняюцца цягнікі?

ПРАМФІНПЛЯН НА ЧЫГУНЦЫ НЕ ДАВЕДЗЕНЫ ДА РАБОЧАГА

БЕЗНАЧАЛЬЛЕ УНОСІЦЬ БЛЫТАНІНУ

На МБВ чыг. мала хто ведае, як выконваецца прамфінплян. Ня ведаюць і рабочыя.

Наконт інфармаваньня рабочых аб выкананьні вытворчых праграм не надумаюць ні адміністратары, ні прафработнікі.

Праўда, прафработнікі апраўдваюцца тым, што адміністратары не даюць ім вестак аб выкананьні прамфінпляну. Каб заставаліць дакучлівых прафработнікаў, адміністратары прысылаюць рапарт:

— Вытворчыя заданьні выкананы. Цягнікі ідуць згодна раскладу. Ёсьць толькі паасобныя спазьненьні.

Зразумела, што такія весткі ня могуць задаволіць ні толькі рабочых, але нават і саміх прафработнікаў. А такімі весткамі адміністратары кормяць прафарганізацыі і рабочых увесь час.

Як-жа даведзен прамфінплян да кожнага рабочага?

— Над гэтым пытаньнем мы зараз ламаем галаву,—кажа намесьнік старшыні вучпрафсожу т. Іваўчанка.—Зараз працуе спэцыяльная камісія, якая паставіла сабе мэтай рэарганізаваць чыгуначны апарат, каб лягчэй давесьці прамфінплян да кожнага рабочага. Але ў нас гэта вельмі цяжкая справа, амаль немагчымая...

А пакуль што на чыгунцы ёсьць рад фактаў нядбайства і расхлябанасьці. Ёсьць выпадкі нядбайства, якія мяжуюцца з простым злачынствам. Напрыклад, рабочы абмятае рэйкі, а машыністы накіроўвае на яго паравоз бяз усякага папярэджаньня і задушвае яго. А потым кажа: «я бачыў толькі насыпкі, а рабочага не заўважыў». Яму і можна паверыць, бо ён у той час быў п'яны да зялёных чарцей.

Значны ўплыў на заняпад працдысцыпліны робіць адсутнасьць выразнага разумоньня настановы партыі аб адзіначальні.

Начальнік вучастку цуці т. Краснапёраў піша ў вучпрафсож: «прашу давяраціць звольніць вартаўніка Кісялевіча за сыстэматычныя нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў»... А РКК слухае і пастанаўляе—«згадзіцца з прапановай адміністрацыі». З гэтага відаць, як тав. Краснапёраў баіцца адказнасьці, як ён імкнецца схавацца за плечы прафарганізацыі.

Ня лепш разумеюць дырэктыву аб адзіначальні прафработнікі. Напрыклад, старшыня вучпрафсожу т. Крук бяз згоды адміністрацыі зьняў з работы 8 чалавек і паслаў іх у вёску. А на другі дзень піша начальніку вучастку: «прашу з 5-IV лічыць у камандыроўцы такіх і такіх рабочых».

Старшыня мясцкому № 1 тав. Зьвёздачкін зьнімае з работы двух сьвесароў і накіроўвае іх на грамадзкую работу. Адміністрацыя, даведаўшыся аб гэтым на другі дзень, не пратэстуючы, замяняе іх другімі рабочымі. І калі тыя вярнуліся, майстар адмовіўся дапусьціць іх да работы. Рабочыя—са скаргай да Зьвёздачкіна, апошні—да адміністрацыі —«вы ня маеце права ня прыняць іх, бо я іх паслаў».

Адсутнасьць выразнага разьмеркаваньня абавязкаў паміж адміністрацыйным пэрсаналам і прафарганізацыяй, умяшальнае аднаго ў функцыі другога, прывярнае ажыцьцяўленьне шкалы спагнаньняў — прыводзіць да ўпаду працдысцыпліны. Выпадкі прыходу на работу ў п'яным выглядзе вельмі частыя. Асабліва многа пораганў працдысцыпліны сярод адсталай групы рабочых, якая ўчора прышла з вёскі і не пасьпела пераварыцца ў рабочым катле.

Здавалася, што наяўнасьць такое групы рабочых павінна была надаць на наложную вышыню культурна-выхаваўчую работу з боку прафарганізацыі. Але на справе ўся амаль культурна-выхаваўчая работа зводзіцца да агульных сходаў.

Досыць падаць некаторыя лічбы, каб устанавіць, што на чыгунцы ня ўсё добра. Прастоі ў абцяжцы (цэх, дзе абцягваюць вагоны бляхай) перашкаджаюць плянавым заданьні на 25 проц. Прабег таварных цягнікоў складае ў месяц 1.700 клм. у сярэднім, замест 2.000 клм., вызначаных плянавым заданьнем. З 68 пасажырскіх цягнікоў ідуць паводле раскладу 62,35 проц., 13, 23 проц. спазьняюцца. З пасажырска-таварных цягнікоў паводле раскладу ідуць 85 проц., спазьняюцца—13.91 проц.

Асабліва дрэнная справа з рухам таварных цягнікоў. З улічаных 180 цягнікоў толькі менш паловы ідуць паводле раскладу. Са спазьненьнямі ідуць звыш 25 проц. цягнікоў.

Па вагонных майстэрнях сяраднята рамонту, як быццам, вытворчая праграма выканана. Прадукцыйнасьць працы павялічана на 13,4 проц. Прастоі вагонаў у рамонце зьніжаны на 2,5 проц. Затое сабекошт рамонту вагону замест 240 руб. ускочыў да 345 руб. 22 кап. Сабекошт рамонту ляднікоўых вагонаў замест 134 руб. складае 152 руб.

Гэтыя лічбы далёка ня поўныя. Ні за першы квартал, ні за студзень і люты няма выразных і поўных лічбаў.

Буйным недахопам зьяўляецца адсутнасьць дакладнага ўліку вынікаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Зразумела, што невыкананьне плянавых заданьняў як пасажырскімі і таварнымі цягнікамі, так і манэўровымі паравозамі перашкаджае плянавай дастаўцы розных машын і тавараў.

Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал і прафсаюзныя арганізацыі чыгуначні павінны рэарганізаваць так сваю работу, каб ісьці ў нагу з сучаснымі тэмпамі нашага будаўніцтва.

А. МАНЬКОЎ.

Чаму буйныя заводы не далі вестак?

Ленін за ўсе іншыя мэталапрацоўчыя прадпрыемствы працаваў за першую дзесяцідзёўку Магілёўскі завод «Чырвоны Адраджэнец», які перавыканаў вытворчую праграму на 18 процантаў.

За ім ідзе віцебская акулярная фабрыка, якая перавыканала вытворчую праграму на 12,7 проц.

На трэцім месцы — рэчыцкі завод «Інтэрнацыянал», які даў 6,2 проц. звыш праграмы.

Далей ідзе завод «Чырвоны Кастрычнік» у Аршанскай акрузе — перавыкапаў вытворчую праграму на 5 проц.

Зусім печакана зьменныя выпрацоўку заводы «Камунар» і «Пралетары» ў Гомелі: першы недавыканаў вытворчай праграмы на 0,2 проц., а другі — амаль на 5 проц.

Што датычыць буйнейшых заводаў мэталяпрамысловасьці—заводаў «Чырвоны Мэталісты» і «Энергія», то яны вестак аб рабоце за першую дэкаду яшчэ не далі.

Прастой на Бабруйскім камбінаце

БАБРУЙСК, 20-IV. (Наш кар.). Сёньня раніцай у лесапільным цэху камбінату на двух лесапільных рамах паламаліся ляфэты, якія ўжо аднойчы былі адрамантаваны. Адсутнасьць запасных ляфэтаў, аб чым мы ўжо ня раз пісалі, прывяла да доўгага прастою дзьвёх трэціх цэху, бо засталася працаваць толькі адна рама.

А. МАГІДАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: Мы патрабуем ад Лесбелу тэрміновага адказу, што ім зроблена для забесьпячэньня камбінату запаснымі часткамі да машын.

ДА ЎВАГІ ЎСІХ ЧЛЕНАЎ ПАРТЫІ, ЧЛЕНАЎ ЛКСМБ, РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ!

У чэрвені адкрываецца

16-ы ЎСЕСАЮЗНЫ ПАРТЫЙНЫ ЗЬЕЗД.

Практыка папярэдніх зьездаў паказала, што прадзьездаўская работа пачынае разгортвацца на старонках **„ПРАВДЫ"** значна раней адкрыцьця зьезду.

Попыт на **„ПРАВДУ"** штодзенна пачынае ўзрастаць, у сувязі з чым выдавецтву неабходна загадзя загатовіць адпаведную колькасьць паперы для таго, каб поўнасьцю і сваячасова ўсіх задаволіць газэтай.

Беларускае аддзяленьне выдавецтва ЦК УсеКП(б) „ПРАВДА", улічваючы гэту вельмі важную абставіну і жадаючы задаволіць газэтай „Правда" ўсіх партыйцаў, камсамольцаў і беспартыйных рабочых і служачых, **просіць паклапаціцца выпіскай „Правды" з падпіскі на май месяц на больш доўгі тэрмін.**

МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 61, тэл. №№ 8-21 і 7-93.

Беларускае аддзяленьне выдавецтва ЦК УсеКП(б) „ПРАВДА"

Толькі на 8 проц. выканана заданьне па адгрузцы бульбы

Каапэрацыя ня выконвае важнейшай дырэктывы

У бягучым годзе на БССР ускладзена заданьне—даць пэўную колькасьць пасеньня і сталовай бульбы для іншых раёнаў СССР.

Не пазьней 25-га красавіка ў Карэлію павінна быць адгружана 1.090 тон пасеннай бульбы, у Ніжнюю Волгу—2.000 тон, у Таджыкістан—2.500 тон.

Апрача таго, для забесьпячэньня рабочых цэнтраў СССР, не пазьней 10-га мая, трэба адасланць сталовай бульбы: Транспасэкцыі — 5.000 тон, Севзапсаюзу — 5.000 тон, ЛСПО — 5.000 тон, Крыму — 6.000 тон і Ленінграду — 2.000 тон.

Аднак, тэмп загатоўкі і адгрузкі бульбы ставіць пад пагрозай зрыву выкананьне ўсіх гэтых заданьняў. Каапэрацыйныя арганізацыі ня ўлічылі усёй важнасьці гэтае справы і марудзяць з выкананьнем заданьняў.

На 20-га красавіка адгружана ўсяго 1.366 тон, або 8½ проц. Загатоўка і адгрузка бульбы праходзіць дрэнна ва ўсіх округах Беларусі і, галоўным чынам, у бульбяных раёнах.

Наркамгандаль запрапанаваў Белпаляводсаюзу, Белкаапсаюзу, саюзу «Плодоовощ» на працягу аднаго дня разьмеркаваць паказаную колькасьць бульбы па раёнах, з улікам абавязковасьці выкананьня адгрузкі не пазьней устаноўленых тэрмінаў.

У раёны адгрузкі трэба пасланць пэрсанальна адказных работнікаў за сваячасовую адгрузку бульбы.

Месцам запрапанавана кожныя 5 дзён інфармаваць Наркамгандаль БССР аб ходзе адгрузкі бульбы.

Каапэрацыйным сыстэмам трэба безадкладна ўзмацніць загатоўку і адгрузку бульбы, каб не сарваць важнейшага заданьня па забесьпячэньні бульбаю раду раёнаў і прамысловых цэнтраў СССР.

Загатоўкі яшчэ не пачаты

(Ад нашага гомельскага карэспандэнта)

У той час, як пляны загатовак бульбы па Гомельшчыне павінны былі быць да 15-га сакавіка выкананымі на 70 проц., фактычна **загатоўкі яшчэ не пачаты.** Такой «дзейнасьцю» загатоўчыя арганізацыі стварылі рэальную пагрозу выкананьню плянаў забесьпячэньня бульбай засеву, прамысловасьці і гарадзкіх цэнтраў.

Сур'ёзнасьць становішча пагыбляецца тым, што райвыканкомы і сельсаветы імкнуцца перашкаджаць загатоўшчыкам выконваць нарады па вывазе бульбы. Увага грамадзкіх працаўнікоў, бядняцка-сераднякіх мас яшчэ не мабілізавана вакол гэтай кампаніі.

Прэзыдыум акрвыканкому зараз прыняў рад сур'ёзных крокаў да выкананьня гэтага важнага заданьня. Загатоўчым арганізацыям запрапанавана безадкладна прыступіць да вываз бульбы да чыгунак і водных прыстаняй. Саюзхлебу запрапанавана забясьпечыць загатоўшчыкаў тою тараю, якая ня будзе скарыстана для хлеба. Дзяржпараходству павінна забясьпечыць загатоўкі патрэбнай колькасьцю танажу.

Для кіраўніцтва ўсёй работай па загатоўцы бульбы акрвыканком вылучыў спэцыяльную тройку. Такія-ж тройкі, адказныя за выкананьне раённых загатоўчых плянаў, будуць вылучаны пры райвыканкомах.

Ш.

Агляд грамадзкага харчаваньня

Грамадзкасьць слаба ўцягнута ў работу

Да раённаў агляд не дайшоў

БАБРУЙСК. (Наш кар.). У Бабруйшчыне на прадпрыемствах арганізаваны 22 брыгады па аглядзе грамадзкага харчаваньня. Абвешчан конкурс на лепшы буфэт і сталоўку. Да ўсіх брыгад прымацаваны санітарныя дактары.

Дрэнна толькі тое, што да гэтага часу яшчэ ня ўсе брыгады разгарнулі, як сьлед, сваю работу. Шырокія масы рабочых у агляд грамадзкага харчаваньня яшчэ ня ўцягнуты. Прафсаюзныя арганізацыі таксама практычнае работы не распачалі, а пакуль што абмежаваліся толькі правядзеньнем агульных сходаў і вылучэньнем рабочых брыгад. Мала хто з прафгрангаў прапрацаваў пытаньні аб становішчы грамадзкага харчаваньня на сваім прадпрыемстве.

Практычныя мерапрыемствы па паляпшэньні работы сталовак яшчэ не намечаны. Да гэтага часу яшчэ ня вырашана пытаньне аб арганізацыі кухні-разьмеркавальніка, дыетычнай і дзіцячай сталовак. ЦРК [illegible] на ад-сутнасьць сродкаў для гэтай мэты.

Слаба праводзіцца работа на пашырэньні грамадзкага харчаваньня ў калгасах. Акрыкалгассаюз вызначыў пункты арганізацыі сталовак у калгасах, але практычных вынікаў пакуль што ня відаць.

Што-ж датычыць раёнаў, дык тут агляд грамадзкага харчаваньня разгорнут зусім слаба.

Такім чынам, трэба адзначыць, што **грамадзкасьць вакол агляду мабілізавана яшчэ слаба.** Ход агляду грамадзкага харчаваньня слаба асьвятляецца ў на сьцэнгазэтах. Акруговая камісія на сваім апошнім пасяджэньні выпрацыявала цэлы рад практычных мерапрыемстваў для ўзмацненьня работы на аглядзе грамадзкага харчаваньня. У бліжэйшы час склікаецца нарада раённых працаўнікоў па аглядзе грамадзкага харчаваньня сумесна з прадстаўнікамі саюзу нархарч для лепшай прапр[illegible] гэтага нытаньня.

А.

Цэны на абед зьніжаны

Аршанская акруговая камісія прарабіла вялікую работу па аглядзе грамадзкага харчаваньня ў акрузе. Пры акрпрафбюро адбылася нарада фабрычна-заводзкіх камітэтаў па пытаньні ўдзелу ў аглядзе грамадзкага харчаваньня. На ўсіх прадпрыемствах наладзіліся мітынгі рабочых і сходы на саюзах, на якіх выбраны рабочыя брыгады ў ліку 80-ці чалавек. Апрача таго, у гэту работу ўцягнута 20 чалавек лёгкіх кавалерыстых.

Рабочыя брыгады ўжо прыступілі да праверкі работы па грамадзкім харчаваньні. На спэцыяльным сходзе, арганізаваным саюзам нархарч, былі заслуханы даклады аб працы сталовак МЦРК. Была таксама праверана работа студэнцкай сталоўкі.

Акркалгассаюз, сумесна з Днепрасаюзам, арганізаваў курсы па падрыхтоўцы кухараў у калгасных сталоўках. Акркалгассаюз мяркуе адкрыць па калгасах округі 25 сталовак і 40 ачагоў.

У горадзе за час агляду ўжо адкрыта адна новая сталоўка для рабочых. **Цэны на абеды зьніжаны на 7 проц.** Сталоўкі пачалі адпускаць абеды на дом па ільготнай цане.

Дрэнна толькі, што ні гарсавет, ні акр. інспэктарыят нарасьветы не правялі ніякай работы па ўцягненьні насельніцтва і вучняў у агляд грамадзкага харчаваньня. Адстае таксама і саюз будаўнікоў, які ня вылучыў рабочых брыгад. Ня зусім добра пастаўлены агляд на раёнах. Да гэтага часу раённыя брыгады не прыступілі да агляду грамадзкага харчаваньня.

ЛІЎШЫЦ.

ДНЕПРАБУД І БССР

Рэканструкцыя дняпроўскай сыстэмы—важнейшая задача беларускай народнай гаспадаркі

Калі ў дарэвалюцыйны час грузазваротам Дняпроўскага басэйну насіў выключна мясцовых характар і абмяжоўваўся перавозкамі, галоўным чынам, дроў і лесу, дык зараз савецкая эканоміка і наша сацыялістычная гаспадарка ставяць перад Дняпром зусім іншыя задачы. Дняпроўскі басэйн павінен абярнуцца ў вялікі магістральны шлях, у транзіт для грузаў Украіны, Беларусі і РСФСР, якія ідуць з поўначы на поўдзень і назад.

Пабудова Днепрабуду, якая скончыцца праз пару год, «ліквідзе» назаўсёды вядомыя непраходныя і неда

Буйнейшы ў Эўропе каніфольны завод

У 1929 годзе плян падсочкі сасны ў БССР выкананы з перавышэньнем. Замест 2.000 гэктараў была падсочана сасна на плошчы ў 3.800 гэкт. Здабыта жывіцы для выпрацоўкі каніфолі і бальзаму-скіпідару—637 тон, замест вызначаных 360 тон.

Пушчаны ў мінулым годзе першы на Беларусі каніфольны завод «Беларускі Батрак» (у Барысаве) выпусьціў прадукцыі на 350.000 руб., што зьменшыла імпарт каніфолі з Амэрыкі. У першым квартале 1929-30 г. завод выканаў праграму на 112 проц.

Паводле водгукаў «Всехимпрома» прадукцыя заводу «Беларускі Батрак» па якасьці лепшая ў Саюзе і ідзе на буйныя папяровыя фабрыкі Ленінграду, Масквы і інш.

У бягучым годзе падсочка сасны асабліва шырока будзе разгорнута. Плошча падсочкі павялічваецца на 400 проц. Будзе здабыта 2.600 тон жывіцы замест 637 тон мінулага году.

У бягучым сэзоне НКЗ пачне пабудову ў Бабруйску новага магутнага каніфольнага заводу з вытворчасьцю ў 800 пуд. каніфолі ў суткі. Завод па сваёй магутнасьці і абсталяваньні зьявіцца амаль буйнейшым у Эўропе. Будаўніцтва яго павінна быць скончана ў кастрычніку 1930 г.

На падсочных промыслах будзе занята каля 5.000 рабочых.

Выкананьне вызначанай праграмы пазбавіць рэспубліку ад увозу з-за межы каніфолі на суму ў 1.200.000 руб. і павялічыць экспарт бальзаму-скіпідару на 100.000 рублёў.

Пачаўся радыёпаход

Выявім і паправім усе „моцкамаўчацелі"

Беларадыёцэнтрам разам з Наркамасьветы, Калгасцэнтрам і іншымі арганізацыямі і ўстановамі абвешчаны вялікі радыёпаход з 15 красавіка па 15 мая.

Мэты паходу — пашырэньне радыёграматнасьці як сярод рабочых, так і сярод працоўнага насельніцтва вёскі, выяўленьне і папраўка «моцнамаўчацеляў», скарыстаньне радыёвяшчаньня на палявых работах калгасаў і саўгасаў і іншае.

У цяперашні час напружанага сацыялістычнага будаўніцтва, калі беднякі і сераднякі кідаюць паасобныя межы, каб працаваць калектыўна, калі на аснове суцэльнай калектывізацыі праводзіцца раскулачваньне — газэта без паперы і адлегласьці набывае вялікае значэньне асабліва ў далёкіх раёнах БССР.

Аднак, у нас ня ўсё добра з прыёмнымі радыёстанцыямі. Значная частка вясковых лямпавых установак у ключах і хатах - чытальнях не працуе. Не працуе таму, што часамі не хапае батарэек, акумулятараў, а большай часткай ад таго, што няма людзей, якія-б хоць крыху разумелі ў радыё-тэхніцы.

Усе паштова - тэлеграфныя канторы на мяйсцох, трансляцыйныя вузлы, ячэйкі таварыства прыхільнікаў радыё павінны прымаць актыўны ўдзел у выяўленьні і папраўцы радыёпрыёмнікаў. Ніякае адмаўленьне ад такой важнай работы не павінна мець месца.

Для зьнішчэньня радыёнеграматнасьці пры арганізацыях таварыства прыхільнікаў радыё трэба нападзіць курсы, гурткі. Скарыстаць тую літаратуру па радыё, якая ёсьць у нашых бібліятэках і чытальнях.

Прыём наведвальнікаў працаўнікамі РСІ

1. Нарком РСІ і яго намесьнікі асабіста прымаюць наведвальнікаў у наступныя лічбы кожнага месяца:

Нарком РСІ—10, 20, 30 ад 9 гадз. ран. да 12 гадз. дню.

1-шы намесьнік—3, 8, 13, 18, 23, 28 ад 9 гадз. ран. да 12 гадз. дню.

2-гі намесьнік—2, 7, 12, 17, 22, 27 ад 9 г. ран. да 12 г. дню.

2. У выпадку адсутнічаньня ў дні прыёму наркома—наведвальнікаў прымае адзін з намесьнікаў наркома, а прыадсутнічаньні апошняга—адзін з членаў калегіі РСІ.

3. Член калегіі і інспэктары прымаюць наведвальнікаў ва ўсе дні заняткаў, за выключэньнем дзён выхадных і занятых на пасяджэньнях.

4. Бюро скаргаў НК РСІ адчыняе запіс з 9 гадз. да 15 гадз., а прымае наведвальнікаў з 9 гадз. да заканчэньня прыёму ўсіх запісаўшыхся на гэты дзень.

Нарком РСІ БССР КАЛНІН.

ТЫ ЯШЧЭ НЯ КУПІЎ БІЛЕТАЎ 4-й ЛЕТАРЭІ АСОАВІЯХІМУ?

ТЫРАЖ

білетаў 4 разрада 4-й пётарэі Асоавіяхіму адбудзецца ў Менску 2—3 мая г. г.

БУДЗЕ РАЗЫГРАНА 3.000 выйгрышаў)—(НА СУМУ 45.074 руб.

БІЛЕТ КАШТУЕ 50 кап.

Сьпяшайцеся купіць білеты! Узмацняйце абарону!

Білеты прадаюцца ў арганізацыях Асоавіяхіму.

Для ўдзелу ў першамайскай дэманстрацыі

Аўтадор, Бюро ФК ЦСПСБ і Асоавіяхім

арганізуюць

калёну взлёсыпэдыстых, матацыклістых і аўтамабіляў.

Ячэйкам Аўтадору, Асоавіяхіму і гуртком фізкультуры правесьці падрыхтоўку для ўдзелу ў дэманстрацыі.

МЕНСК

У Гарсавеце

ДА СЬВЯТКАВАНЬНЯ 1-га МАЯ

Паводле пастановы прэзыдыуму Менгарсавету, 1-га мая ўвесь гандаль будзе спынены. 2-га мая будуць адчынены толькі дяжурныя магазыны. У першамайскія сьвяты сталоўкі будуць працаваць нармальна.

ПЕРАБРУКАВАНЬНЕ ВУЛІЦ

Гарсавет узьняў хадайніцтва перад СНК аб выдачы сродкаў на перабрукаваньне вуліцы 2 Лекерта, пры якой разьмешчаны заводы «Энэргія» і «Бальшавік».

ВЫДАЧА НАСЕЛЬНІЦТВУ ЗАБОРНЫХ КНІЖАК

Прэзыдыум гарсавету запрапанаваў МЦРК выдаваць заборныя кніжкі ўсім асобам і іх утрыманцам, якія займаюцца грамадзка-карыснаю працай, незалежна ад пазбаўленьня іх выбарчых правоў.

ПУСК КАНАЛІЗАЦЫІ

Паводле паведамленьня Водаканалу, Менская гарадзкая каналізацыя будзе пушчана не пазьней 1-га мая.

З лістоў рабселькораў

ГАЛАВАЦЯПЫ З ЦІП ЗРЫВАЮЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ КВАЛІФІКАВАНЫХ КАДРАЎ

НКП і біржа працы вядуць вялікую работу па стварэньні кваліфікаваных кадраў рабочых-будаўнікоў.

Здаецца, тут усе зацікаўленыя арганізацыі павінны найсьці насустрэч гэтай вялікай працы, але справа стаіць ня зусім так.

Накіраваныя біржай працы ў ЦІП і прапушчаныя праз мэдкамісію беспрацоўныя чакалі часу заняткаў. Але загадчык будаўнічых курсаў ЦІП Фрэйдлік парашыў, што патрэбна яшчэ і псыха-тэхнічная камісія. Між тым, дактароў псыха-тэхнікаў у нас няма, і таму за гэту справу ўзяўся сам загадчык...

Псыха-тэхнічная камісія пад кіраўніцтвам Фрэйдліка насіла ня зусім звычайны характар. Выклікаюць у габінэт беспрацоўнага—здаецца чалавек, як чалавек,—але Фрэйдліку здаецца, што ў яго вельмі «дурная морда», і гэта служыць прычынай для браку. Другі аказаўся вельмі непаваротным—таксама забракавалі. Трэці здаўся старшыні камісіі вельмі тупым, чацьверты—нізкі ростам і г. д., і г. д. У выніку такога дзікага «адбору» былі забракаваны 40 проц. беспрацоўных з тых, якія прайшлі праз мэдкамісію...

З прычыны такога арыгінальнага адбору, будаўнічы цэх курсаў ЦІП укамплектаваны толькі на 50 проц., а папоўніць такі недахват немагчыма, бо не хапае людзей на біржы.

Такую работу, такі адбор на курсах ЦІП, у той час, калі ў нас не хапае кваліфікаваных рабочых, трэба кваліфікаваць, як шкодніцтва або галавацяпства самай вялікай маркі.

Адпаведныя арганізацыі павінны зацікавіцца справай псыхатэхнічнай камісіі». З.

НЯМА НАРАДАЎ НА АДГРУЗКУ ЛЕСУ

Лепельскі вучастак Лесбелу сваячасова загатаваў і вывез фанэрную драўніну. На складзе ст. Лепель ляжыць 1.000 куб. мэтраў драўніны, але загатоўлены лес ляжыць, а прыёмшчыка няма: ня гледзячы на шматлікія запатрабаваньні аб прысылцы. Лесбел не дае нарадаў на адгрузку, а ў лесасырцы фабрыкі адчуваюць патрэбу.

Г.

ВУЧОБА БЯЗ РЭАЛЬНЫХ ВЫНІКАЎ

Белсельтрэст арганізаваў курсы па перападрыхтоўцы трактарыстых. Вучоба на курсах настаўлена дрэнна. Калі выводзяць курсантаў на поле, дык на трактары даюць папрацаваць толькі тры мінуты. Частак трактару не паказваюць і ня вучаць як яго разьбіраць. Такія заняткі не дадуць рэальных вынікаў і дарэмна трацяцца сродкі дзяржавы.

МУХА.

Скора пачнецца пабудова другой раённай электрастанцыі

Гэтымі днямі падпісаны дагавор на праектаваньне другой раённай, Гомельскай Электра-станцыі паміж ВСНГ БССР і Энэрэбудам. Эскізны праект павінен быць паданы ВСНГ да 15-га мая.

Падрыхтоўчыя работы пачнуцца ў гэтым годзе, на што асыгнуецца 500.000 рублёў.

Адначсова заключаны дагавор з маскоўскім «Торфстроем» на арганізацыю тарфяной гаспадаркі на Кабляянскім масыве.

У Гомелі арганізуецца кіраўніцтва будаўніцтвам другой раённай электрастанцыі.

13.000 экскурсійных літароў

На 1930 год Наркамасьветы БССР перадана 13.000 экскурсійных ільготных літароў. Па акругах разьмеркавана 8.000 літароў, з якіх Меншчыне—1.600, Гомельшчыне—1.300 і г. д. Апрача таго, НКА перадае газэце «Чырвоная Зьмена» 400 літароў, школьнікам і піянэрам—400, саюзу працасьветы — 300, дому Чырвонай арміі—150, фабзавучам і прафшколам — 850, ЦВ краязнаўства —100, ЦСПСБ—500, ВСФК—100 і г. д.

Пуск новых трамвайных вагонаў

З учарашняга дня ў Менску пушчаны яшчэ 4 трамвайныя вагоны. Колькасьць трамваяў па лініі Таварная—Камароўка павялічана на 3. Па лініі Пасажырскі вакзал — Старажоўка будзе дадаткова хадзіць яшчэ адзін трамвайны вагон.

Транспартны трэст узьняў перад Менгарсаветам пытаньне аб адкрыцьці двух новых трамвайных маршрутаў: Таварная - Старажоўка і Камароўка-Пасажырская.

Новыя сталовыя МЦРК

25-га красавіка МЦРК адкрывае ў садзе «Прафінтэрн» рабочую сталоўку.

У першых числах мая адкрываецца новая сталоўка МЦРК па Савецкай вул. № 89.

МЦРК адкрывае ва ўрочышчы Тучынка, каля цагельных заводаў, 2 сталоўкі. Апрача таго адкрываюцца сталоўкі пры цагельных заводах у Лошыцы і Мядзьвежыне. На цагельным заводзе № 1 будуецца вялізная сталовая на 1.200 чалавек.

МЦРК распачаў пабудову сталовае на 800 чалавек пры гуце «Пралетары», але гэта будаўніцтва, з прычыны недахопу цэглы і катлоў, спынілася. Між тым, рабочыя гуты «Пралетары», цэнтральных майстэрняў, фармазаводу і малочнага заводу «Ільліч», для якіх была прызначана гэта сталоўка, ня маюць дзе абедаць. МЦРК павінен хутчэй скончыць пабудову сталовае.

ДА НАРАДЫ ВЫТВОРЧЫХ ЯЧЭЕК МОПР'у.

ЦК МОПР'у Бел. пастанавіў — ПЕРАНЕСЬЦІ — ПЛЕНАРНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

IV Пленуму ЦК МОПР'у Бел.

у клюбе «Рабпрос»

НА

агульна-гарадзкую НАРАДУ ВЫТВОРЧЫХ ЯЧ. МОПР'у на 22 красавіка,

на якім будзе заслухан даклад

аб новых формах і мэтодах работы ў рэканструкцыйны пэрыяд

дакл. т. Калмык.

Мен. АК МОПР'у просіць сваячасова зьявіцца ўсім актывістам вытворчых ячэек МОПР'у на аб'яднаную нараду з пленумам ЦК МОПР'у Бел.

Пасьля пасяджэньня—КІНО.

Мен. АК МОПР'у.

На Асінбудзе

Галоўны інжынэр Асінбуду т. Апейнікаў паведаміў нашаму супрацоўніку, што мантаж турба-генэратара, катлоў і электра - станцыі вядзецца фарсаваным тэмпам.

Работы ў значнай ступені затрымліваюцца дзякуючы нястачы медзі. З 500 тон недаатрымана 250-300 тон. У сувязі з гэтым часова спыняюцца работы па лініях перадач.

Адміністрацыя Асінбуду зьвярнулася ў Энэргацэнтр СССР і ВСНГ БССР з просьбаю прыняць тэрміновыя меры да ўзмацненьня дастаўкі на Асінбуд медзі.

Першая на Беларусі фабрыка гадзіньнікаў

Інжынэр Вінтэр, які нядаўна вярнуўся з-за мяжы, унёс у прэзыдыум ВСНГ прапанову аб пабудове ў Віцебску прыакулярнай фабрыцы першай на Беларусі фабрыкі гадзіньнікаў. Прэзыдыум ВСНГ даручыў Белмэталятрэсту і інжынэру Вінтэру распрацаваць гэта пытаньне і ў бліжэйшым-жа часе паведаміць прэзыдыуму.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

ПТ ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 28 красавіка ў 18 з пал. гадз. на пасяджэньні ПТ будуць разглядацца справы наступных т. т.:

ШЫМАНСКАГА Маісея Папікарпавіча, СКАВІНСКАГА Паўла Адамавіча, СЯЎКО Міколы Васільевіча, МАЗУР Гапены Мікітаўны, КАМІСАРАВА, Пінхуса Сіманавіча, БЛЮМІНА Ісака Лазаравіча, ТУРЫНАЙ Сары Міхалеўны, ГЕРШАНОВІЧ Евы Язэпаўны, КАНТАРОВІЧА Ісака Эльлевіча, ВІТКОЎСКАГА Янкі Антосева, ФІЛАТАВА Янкі Пятровіча, ГОМЗЫ Мікапая Паўлавіча, МУХІНА Васіля Макаравіча, БЯЧУНА Язэпа Васільевіча, КАЗЛОВА Алеся Мікітавіча, ГАЛЬШТЭЙНА Абрама Ісакавіча, СМАНЦЭРА Янкі Янкавіча, ГЛУШЫНСКАГА Іената Юр'явіча, КАРАТАШОВА Янкі Сымонавіча, ХРЫСАНФАВА Янкі Хрысанфава, ГВАЗЬДЗЁВА Паўла Мікітавіча, АНІШКЕВІЧА Васіля Захаравіча, БОГАД Рувіма Ісакавіча, ФЭЙГЕЛЬМАНА Яўхіма Лонавіча, ВАЙЦАХОВІЧА Сьцяпана Пятровіча, ПРУЖЫНІНАЙ Хавы Барысаўны, ІОФЭ Гіршы Германавіча, КЛІМАВА Васіля Данілавіча.

Гэтыя таварышы запрашаюцца прыняць удзел пры разглядзе іх спраў. Праезд за свой кошт. Таксама запрашаюцца старшыні праверкомаў, дзе праходзілі чыстку гэтыя таварышы і сакратары ячэек, у якіх яны лічацца на вучоце, і знаходзяцца ў Менску.

АД ЦКК Усе КП(б)

Парттройка ЦКК УсеКП(б) ад 24-га красавіка ў складзе т. т. Нікансрава, Шкірыча і Рыскіна пачне разгляд апэляцый на рашэньні ЦКК КП(б)Б на пытаньні чысткі. Разгляд апэляцый усганоўдены ў наступным парадку:

24-га красавіка будуць разглядацца апэляцыі наступных т. т.: Адзярэйкі Кастуся Мікалаевіча, Беларыцкага Мэра Іцкавіча, Баціна Цімаха Васільевіча, Гаварухіна Мікалая Сымонавіча, Клябанава Майсея Давідавіча, Карачуна Уладзімера Яўхімавіча, Кроля Льва Саламонавіча, Лікума Альбэрта Эрнэставіча, Літвінава Апанаса Пракопавіча, Лібермана Язэпа Давідавіча, Палянчука Трафіма Мікітавіча, Русовіча Ігната Ігнатавіча, Рудзенскага Антося Палікарпавіча, Хробата Вінцэся Вінцэсевіча, Шатэрніка Яфрэма Гарасімавіча, Харленкі Андрэя Тодаравіча, Харытончыка Аляксандра Рыгоравіча, Мельчанкі Мікалая Іванавіча, Зянькевіча Баляслава Мікалаевіча і Якімовіча Зьмітра Рыгоравіча.

25-га красавіка—Сапікава Андрэя Тодаравіча, Хвашнянскага Язэпа Сымонавіча, Котана Майсея Аўсеевіча, Катлова Емяльяна Андрэевіча, Наваркова Сяргея Сяргеевіча, Каваленкі Кузьмы Васільевіча, Кірылепкава Піліпа Сьцяпанавіча, Кужалёва Льва Сьцяпанавіча, Халаненкі Маркі Кузьміча, Бартковіча Эдуарда Пятровіча, Вакіноўскага Карла Леапольдавіча, Жолудзя Мірона Мітрафанавіча, Старадзьнава Сьцяпана Андрэевіча, Талтупова Сьцяпана Савасьцянавіча, Кандраценкі Хвядота Тодаравіча, Іофэ Карпэля Майсевіча, Халькова Макара Яўменавіча, Макарэўскага Георга Гарасімавіча, Камінскага Станіслава Язэпава, Плотнікава Мікалая Васільевіча.

26-га красавіка—Чарняўскага Барыса Рыгоравіча, Міцкевіча Кастуся Арцем'явіча, Капчука Аляксандра Якубавіча, Савіткава Івана Васільевіча, Бэмбэля Пятруся Баніфатавіча, Вялюгі Міхася Ігнатавіча, Конява Пракопа Антонавіча, Лукашука Мікіты Якімавіча. Палуйчыка Міхася Сьцяпанавіча, Каханчыка Івана Карпавіча, Кронгаўза Льва Давідавіча, Дамарацкага Міхася Іванавіча, Даўмана Фэлікса Раманавіча, Лукошкі Мікалая Прохаравіча, Караткевіча Івана Цытавіча, Вяржбіцкага Мацея Рыгоравіча, Тарасава Івана Ільліча, Бляхмана Захара Самуілавіча, Байката Мікалая Самуілавіча, Чарнушэвіча Зьмітра Сілавіча, Гарухіна Зьмітра А., Ігнацюка Міхася Філіпавіча, Шакала Івана Георгавіча, Гарачуна Уладзімера Сільвэстравіча і Краўчанкі Івана Савэльлевіча.

Просьба да ўсіх падаўшых апэляцыі таварышоў, якія пералічаны ў гэтым сьпісе, у паказаны тэрмін зьявіцца на пасяджэньне партройкі ЦКК УсеКП(б) па адрасе—Менск, Савецкая, 55, ЦКК КП(б)Б. РК і ячэйкам паклапаціцца, каб усе пералічаныя т. т. былі неадкладна паведамлены. Праезд за свой кошт.

СЁНЬНЯ

Дом Камасьветы. У 20 гадз. — дакл. тав. Стракоўскага «Вынікі выкананьня прамфінпляну ў прамысловасьці БССР за першае паўгодзьдзе». Пасьля — маст. частка. Біл. па РК КП(б)Б і ЛКСМБ і ў чыт. Дому.

Вячэрняя саўпартшкола. Нарада выкл. палітэканоміі 1-га курсу. Яўка абавязкова. Пач. у 19 гадз. — пакой № 3 Дому Камасьветы.

Курсы ш-ш. інструктароў. У 19 гадз. заняткі абедзьвюх груп: шахматнай — у Доме Працасьветы і шашачнай — у клюбе будаўнікоў (3-ці паверх).

Дом пісьменьніка (Савецкая, 68). Нарада заг. школ г. Меску. Пач. у 19 гадз. Парадак дня: аб узнагародзе лепшай школы пераходзячым сьцягам імя «Пионерской Правды». Прысутнасьць загадчыкаў абавязкова.

Бюро фізкультуры ЦСПСБ разам з АСФК склікае агульна-гарадзкую нараду фізкульт. актыву. Пач. у 19 гадз. у залі пасядж. ЦСПСБ. Парадак дня: аб летніх формах гуртк. і мас. фізкульт. працы ў горадзе і ўдзеле фізкультурнікаў у першамайскім сьвяце. На нараду выклік. усе бюро ФК ЦП саюзаў, старшыні, старасты бюро гурткоў і фізкультактыў прафсаюзных, клюбн. вайск. і навуч. устаноў і ўсе інструктары фізкультуры Менску.

Дом Асьветы. У 19 гадз. дыспут на тэму: «Бібліятэка ідыншэ прайбэр». З дакладам выступіць прафэсар Эрык. Запраш. асьветнікі. Уваход па чл. білетах.

Цэнтральная камісія па аглядзе грамадзкага харчаваньня склікае 21-га красавіка агульны сход кухароў г. Менску па пытаньні аб якасьці страў у клюбе нархарч (Энгельса, 6). Яўка ўсіх кухараў абавязкова. Запрашаюцца ўсе брыгады па аглядзе сталовак.

ЗАЎТРА

Шахматна-шашачная камісія ЦСПСБ. У 20 гадз. (памяшк. культ. сэктару ЦСПСБ, дом Працы, 2-гі паверх) пасядж. камісіі. Запраш. шах.-шаш. актыў.

Курсы шофэраў. Пачаўся набор на курсы шофэраў пры Мен. біржы працы. Прыём заяў у даведкавым бюро да 26 крас.

Ад менскай біржы працы. Мэдычныя працаўнікі: дактары, зубдактары, фэльчары, мэдсёстры, ахматмладу, санітаркі, акушэркі, драгістыя, фармацэўты, лекпомы і інш., што знаходзяцца на вучоце біржы працы, павінны зьявіцца 29 крас. у 10 гадз. у бюро пасылкі для перарэгістрацыі.

Прыём на курсы ЦІП'у. Распачаўся прыём на курсы ЦІП'у. Тэрмін навучаньня на цясьлярскім цэху—4 месяцы і каменна-кладачным—3 месяцы. Прыём заяў ад беспрацоўных праз біржу працы. Таварышы, якія заняты на будаўнічых работах, падаюць заявы ў фабкомы. Для чорнарабочых будуць заняткі вечарам пасьля працы. Курсанты атрымл. стыпэнд. 10 руб.

Агульны сход цэх'ячэйкі ЛКСМБ дашкол. устаноў па пытаньні аб выніках сацспаборніцтва. Запраш. дашкольніцы і работ. дзіцяч. дамоў. Пач. у 19 гадз. у Доме Працасьветы.

БДУ. У 20 гадз. 30 м. у Акт. зале —адкрыты партыйна-камсамольскі сход яч. КП(б)Б Наргасу. Запраш. усе студэнты і нав. працаўнікі факультэту.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Сёньня а 6 г. увеч. у памяшканьні ЦК МОПР БССР (Савецкая, 87)

АДКРЫВАЕЦЦА

IV Пленум ЦК МОПР БССР

ПАРАДАК ДНЯ ПЛЕНУМУ:

1. Справаздача прэзыдыуму ЦК МОПР БССР (дакл. т. Славінскі). 2. Аб новых формах і мэтодах работы (дакл. тав. Калмык). 3. Даклад Магілеўскага АК МОПР'у. 4. Аб справаздачна-перазыбарчай кампаніі (дакл. т. Левін). 5. Бягучыя справы.

Сакратар ЦК МОПР БССР Калмык.

Пятыраная нарада вытворчых ячэек МОПР'у г. Менску.

КЛЮБ Працасьветы Аўторак, 22 красавіка

Менскі Акруговы камітэт МОПР'у —) СКЛІКАЕ (—

агульна-гарадзкую пашыраную нараду вытворчых ячэек МОПР'у

Парадак дня: 1. Даклад аб новых формах і мэтодах работы ў рэканструкцыйны пэрыяд—дакл. тав. КАЛМЫК. 2. Аб удзеле ў сьвяткаваньні 1-га Мая.

На нараду павінны зьявіцца ўсе члены бюро калектываў, цэхавых і зьменавых ячэек, зборшчыкі членскіх узносаў і члены рэвізійных камісій.

Уваход па білетах, разасланых па ячэйках | Пасьля нарады—новы мопраўскі кіно-фільм „Браты здалёку" | Запрашаюцца члены ФЗМК і культкамісіі

Пачатак роўна а 7 гадз. увеч. | Менскі Акруговы Камітэт МОПР'у.

ЦП САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ

22 красавіка а 8 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу «Саўгандальслужачы» склікае

МІТЫНГ-ЗЬЛЁТ УСІХ ВЫЛУЧЭНЦАЎ,

што працуюць за ўстановах гор. Менску, якія аб'яднаны саюзам саўгандальслужачых

На гэты мітынг абавязкова яўка вылучэнцаў, старшынь МК і кіраўнікоў устаноў. Запрашаюцца для ўдзелу ў мітынгу рабочыя, якія шэфствуюць над установамі, а таксама ўсе члены саюзу саўгандальслужачых.

На мітынгу рапартуюць МК: ЦРК, ВСНГ і НКФ аб становішчы вылучэнцаў, умовах працы вылучэнцаў і інш., а таксама рапартуюць па аднаму вылучэнцу: Дзяржгандбелу, ЦРК і ЦСК аб умовах іх працы.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР Сезон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Панядзелак, 21 красавіка, адкрыты паказ Юр. Юр'іна

КАЛІ ПЯЮЦЬ ПЕЎНІ п'еса ў 7 абразох, 5 дзеях.

Білеты ў касе тэатру. Пачатак а 8 гадз

Кіно „СПАРТАК"

3 панядзелка, 21 красавіка замежны мастацкі фільм

Пракурор Ёрдан драма ў 7 част.

Пачат. 1 с.—7 г., 2 с.—9 г., 3 с.—10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА — УЗЕМАДАЦЯМОГІ

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12

АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. увеч

Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.

Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.

Прыём хэміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч.

штодзенна

Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.

Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.

Дзяжурства дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.

Начное дзяжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.

Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

ТРЕБУЕТСЯ БУХГАЛТЕР-ПРОИЗВОДСТВЕННИК со стажем.

Служба в Минске.

Оплата по договоренности.

Заявления с указанием стажа направлять:

НЕВЕЛЬ, ЛЕСОХИМ.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА".

3 панядзелка, 21 красавіка

На вячэрніх кіно-сэансах звыш праграмы выступае прыехаўшы з-за мяжы нямецкі вынаходца ДЖЭФРЫС, які дэманструе сваю вынаходку—цуда сучаснай тэхнікі

РАДЫЁ-КАРАБЕЛЬ

Джэфрыс кіруе караблём, вядзе атаку, страляе з гармат і інш., выключна па радыё, бяз удзелу чалавека. Джэфрыс запаліць на караблі па радыё фэерверк! Радыё-карабель на сцэне, радыё-станцыя сярод публікі.

На экране на дзённых і вячэрніх кіно-сэансах дэманструецца мастацкі фільм «АРМЭНКІНО»

ЗАМАЛУ

ў 7 частках.

Звыш праграмы культур-фільм ПАМЯЦІ ІЛЬЛІЧА ў 1 частцы.

Пачатак дзённых сэансаў: 1-шы—а 1 гадз., 2-гі—а 3 гадз. 15 м. Каса адкрыта ад 12 гадз. дня. Цэны ад 15 к. да 35 кап.

Пачатак вячэрніх кіно-сэансаў: 1-шы—а 7 гадзіне Каса—ад 5 гадз.

Выключна мастацкі фільм, вытворч. Ленінгр. САВКІНО

Гэты фільм прымушае задумацца многіх...

У галоўных ролях: Вольга Ленская, нар. арт. Е. Карчагіна-Александроўская, С. Мінін, Ф. Міхайлаў.

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. — Каса адчынена ад 5 гадз.

На дзённыя сэансы каса адчынена ад 12 гадз. дня.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"

3 панядзелка, 21 красавіка

мастацкі нямецкі фільм паводле навэлі Стэфана Цвэйга

СТРАХ

драма ў 8 частках.

У галоўных ролях: Эльга Брынк, Генрых Эдвардс, Густаў Фрэліх.

Штодзенна 3 сэансы.

Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз., 2-га—а 8 г. 45 м., 3-га—а 10 г. 30 м.

КАСА АДЧЫНЕНА АД 5 ГАДЗ.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"

З панядзелка, 21 красавіка, культур-фільм

СЫН ПАЎДНЁВЫХ МАРЭЙ

(МОАНА)

этнаграфічны нарыс у 7 частк.

Штодзенна 2 сэансы.

Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз., 2-га—а 8 г. 30 м.

Каса адкрыта з 12 гадз

НАВІНКІ!

ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ

Бібліятэка партыйнага работніка

Г. МАЛЕНКОЎ. Падвышэньне прадукцыйнасьці працы і задачы нізавой партыйнай работы. Стар. 93. Цана 25 кап.

А. СЯНКЕВІЧ. Работа ЛКСМБ і задачы партыкіраўніцтва. Стар. 32. Цана 12 кап.

Што сказаў першы ўсесаюзны зьезд калгасьніц. Стар. 52. Цана 15 кап.

А. ЧАРАЎ. Новыя формы змычкі. Стар. 40. Цана 12 кап.

І. КОГАН. Паўстаньне на Краснай Прэсьні. Стар. 36. Цана 10 кап.

Вакол сьвету

Д. КЭР. На караблёх Васко дэ-Гама. Стар. 199. Цана 60 кап.

Кніжкі прадаюцца ў Кнігарнях БДВ, ЦРК, БКС і выпісваюцца: Менск, Цэнтральная Кнігарня БДВ—Кніга-Поштай

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

ПРАДАЮЦЦА БОЧКІ 3-НАД ФАРБЫ і шкляныя балёны ад кіслаты.

Савецкая 63, друк. „Зьвязды" зварачваць да заг. гас. ад 9 да 11 гадз. ран.

Згубленыя і ўкрадзеныя наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Чл. біл. саюзу гарбароў Матуковіч С. З 66
Асабов. карт. Прышчэпенка К. В выд. б. Сьцепск. ВВК 66
Пашпарт Стэкіна Р. Я., выд Лукоўнік. РВК 67
Пасьведч. Лукашэвіча Я. В., выд калгасам «Прабуджэньне» 67
Каап. кн. Хорука І. О., выд. Мен прыгар. спаж. т-вам «Земляроб». 67
Чл. біл. саюзу нархарч № 116 біржы талён, выд. Мен. біржы працы Берковіч Х. З. 67
Чл. кн. саюзу саўгандальслуж кн. ашчадкасы Штанюк А. 674-67
Чл. кн. саюзу мэдсанпраны, залі кн., выд. школай мэд. сёстр 676-6
Асабов. пасьведч. Шаўчэнка Г. М выд. Асарэвіцк. с.-с. 67

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галоўлітбел № 337.